ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 САКАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 42 (28658)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Пра методыку выбару ходу

Капітан «бяспечнага плавання»

Стаць вядомым у шаснаццаць?

ЛІЧБА ДНЯ

4340,8 тысячы чалавек

было занята ў эканоміцы Беларусі ў студзені 2018 года, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Па звестках Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, на канец месяца было зарэгістравана 23,8 тысячы беспрацоўных. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 0,5 % ад колькасці працоўнай сілы.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	-10°
Віцебск	- 10°
Гомель	- 9°
Гродна	-11°
Магілёў	- 11°
Мінск	- 10°

ISSN 1990 - 763X

Цеплыня і гасціннасць. Як у кнігах

Кожнаму — па ўлюбёным выданні!

Кніжнае свята распачалося — XXV Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш сабрала гасцей і ўдзельнікаў з розных краін. Прэзентацыі апошніх кніжных навінак, абмеркаванні падзей, што адбываюцца ў літаратурным жыцці, цёплыя сустрэчы сяброў і нават... канкурэнтаў. На кніжны кірмаш завітаць варта! Каб прычыніцца да прасторы, што акумулюе веды і меркаванні пра наш час.

Фота БЕЛТА.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На ўрачыстым адкрыцці выстаўкі, якое адбывалася на галоўнай пляцоўцы выставачнага цэнтра на праспекце Пераможцаў, 14, побач са сцэнай яблыку не было дзе ўпасці. Усе нібы хацелі першымі пачуць, дакрануцца да таямніцы нараджэння, выхаду ў свет новых кніг... **Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ** зачытаў прывітальнае слова кіраўніка дзяржавы ўдзельнікам выстаўкі, а таксама дадаў:

— Вока радуецца, калі я бачу тыя выдатныя кніжныя творы, якія запаўняюць выставачную залу. Пачынаеш разумець, што кніга сёння — гэта не толькі крыніца ведаў (з улікам развіцця інтэрнэту, дзе таксама можна знайсці неабходную інфармацыю), а найперш паказчык інтэлектуальнага развіцця грамадства. Я вельмі рады, што дзякуючы такім мерапрыемствам мы бачым, як развіваецца наша супольнасць.

СТАР. 4

■ Тэхналогіі

ЁН РАЗГЛЕДЗІЦЬ З ВЫШЫНІ НАВАТ ПАЧАК ЗАПАЛАК

Беспілотны лятальны апарат (БПЛА) «Геаскан 201», прызначаны для абнаўлення геаграфічнай інфармацыйнай сістэмы (ГІС), атрымаў сертыфікат лётнай прыдатнасці



Плануецца, што першыя палёты для аэрафотаздымак з дапамогай БПЛА для навукова-даследчых мэт адбудуцца ўжо сёлета ў сакавіку. Крыху раней беларускае прадпрыемства сельскагаспадарчых аэрафотагеадэзічных пошукаў (БелПСГАГП) завяршыла працэдуру рэгістрацыі беспілотнага лятальнага апарата ў Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэце краіны.

Для выканання аэрафотаздымкі на беспілотным лятальным апараце група спецыялістаў прадпрыемства прайшла курс навучання па рабоце з гэтым тыпам беспілотных комплексаў у Санкт-Пецярбургу. Беспілотны комплекс расійскай вытворчасці «Геаскан 201» дазволіць у аператыўным рэжыме выконваць аэрафотаздымку звышвысокага раздзялення (да двух сантыметраў) невялікіх участкаў мясцовасці (да 50 квадратных кіламетраў). Фотаздымкі робяцца ў мэтах маніторынгу тэрыторый, зямельнага фонду, сельскагаспадарчых палёў, інвентарызацыі і інжынерных пошукаў. Комплекс дазваляе вывучаць канкрэтныя тэрыторыі, напрыклад садовыя таварыствы. Выкарыстанне землеўпарадчыкамі гэтай тэхнікі будзе спрыяць далейшаму спрашчэнню працэдуры аднаўлення граніц зямельных участкаў.

У цэлым, дзякуючы ўкараненню сучасных лічбавых тэхналогій атрымання даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі ў 2017 годзе, агульны аб'ём аэрафотаздымачных работ прадпрыемства па тэрыторыі Беларусі склаў 41 тысячу квадратных кіламетраў (у 1996 годзе гэтая лічба складала 12 тысяч квадратных кіламетраў).

Сяргей КУРКАЧ.

■ Парламенцкі дзённік

АБЫСЦІ МАНІПУЛЯЦЫІ І ПРЫЙСЦІ ДА ДЫЯЛОГУ

Пра гэта і не толькі — у тыднёвым аглядзе падзей у Палаце прадстаўнікоў

Візіт у Швейцарыю, перагаворы з прадстаўніком Украіны, асаблівасці сацыялагічных даследаванняў, дапамога ў развіцці сацыяльнага прадпрымальніцтва. Тыдзень для дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу выдаўся актыўны.

Адбываецца першы ў гісторыі беларуска-швейцарскіх міжпарламенцкіх адносін **афіцыйны візіт дэлегацыі Беларусі ў Швейцарыю.** Яе ўзначальвае старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка. Падчас перагавораў бакі засяродзяцца не толькі на гандлёва-эканамічных адносінах, але і абмяркуюць паглыбленне крэдытна-інвестыцыйных і гуманітарных сувязяў, рэалізацыю праектаў у галіне сельскагаспадарчай кааперацыі.

Развіваць не толькі гандлёва-эканамічныя, але і **парламенцкія сувязі Беларусі і Украіны** заклікаў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў Пірштук на сустрэчы з намеснікам міністра замежных спраў Украіны Васілём Бондарам. Бо, напрыклад, апошняе пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу і Вярхоўнай Рады Украіны адбылося пяць гадоў таму. Беларускі віцэ-спікер адзначыў, што настаў гістарычны момант, каб змяніць гэту тэндэнцыю, і прапанаваў парламентам «выйсці на нармальны сістэмны дыялог».

Прадстаўнікі інфармацыйна-аналітычнага цэнтра расказалі дэпутатам аб тым, як зараз вывучаюць грамадскую думку і **чым сацыялагічныя даныя могуць дапамагчы дзяржаўным органам.** Дырэктар ІАЦ Аляксей Дзербін заклікаў асцярожна і крытычна ставіцца да вынікаў сацыялагічных даследаванняў, бо не ўсе яны выконваюцца па ўстаноўленай працэдуры. Але нават аб'ектыўна атрыманыя вынікі могуць быць скажона інтэрпрэтаваныя. Начальнік упраўлення сацыялагічных даследаванняў ІАЦ Ігар Пінчук прывёў прыклады некарэктнага выкарыстання сацыялагічнай інфармацыі, маніпуляцыі грамадскай думкай з дапамогай яе.

Таксама парламентарыі абмеркавалі, якім чынам можна **паспрыяць развіццю сацыяльнага прадпрымальніцтва,** якое заклікана не толькі атрымліваць прыбытак, але і вырашаць праблемы ў грамадстве. Як адзначыла член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Жанна Стаціўка, гэта сфера патрабуе ўнясення змяненняў у заканадаўства, пра што зараз і ідзе дыскусія. Дэпутат растлумачыла, што сацыяльны бізнес можа ствараць новыя працоўныя месцы не толькі для інвалідаў, але і, напрыклад, для людзей, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі, якія пакутуюць ад алкагольнай і (ці) наркатычнай залежнасці. Пры гэтым галоўнае адрозненне ад звычайнага работадаўцы будзе заключацца ў тым, што на сацыяльным прадпрыемстве прыбытак стануць накіроўваць не толькі на развіццё, але і на псіхалагічную падтрымку сацыяльна ўразлівых работнікаў, іх сем'яў. Асабліва актуальным гэта пытанне бачыцца таму, што цяпер актыўна ідзе працэс разняволення бізнес-ініцыятывы.

Вераніка ПУСТАВІТ

■

■ Мясцовы час

ЯКІ ПЛЁН АД ДНЯ ЖЫВЁЛАВОДА?

Адноўлены аўтобусны маршрут і асвятленне вуліц

У Магілёве прайшла калегія галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама. Удзел у яе рабоце прыняў міністр культуры Юрый БОНДАР.

— Магчыма, не ўсё ўдалося рэалізаваць, але рашэнне самых актуальных задач было забяспечана. У абсалютнай большасці калектываў захоўвалася стабільнасць, на вытворчасцях была забяспечана занятасць працуючых, выконваліся мэтавыя паказчыкі, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА,** падводзячы вынікі дзейнасці за мінулы год.

Яна звярнула ўвагу на тое, што трэба арганізаваць больш прадукцыйную работу на месцах, часцей сустракацца з насельніцтвам, выбіраць больш актуальныя тэмы для правядзення дзён інфармавання, знаходзіць новыя формы работы. Адзін з найбольш удалых прыкладаў — правядзенне Дзён жывёлавода ў сістэме АПК. Летась у рамках яго адбылося звыш 2,5 тысячы сустрэч інфармацыйных груп з працоўнымі калектывамі.

Паступіла 732 пытанні і прапановы, з іх 119 узятыя на кантроль. Дзякуючы гэтым сустрэчам адноўлены аўтобусны маршрут «Кіраўск—Клічаў», праведзены работы па асвятленні некалькіх вуліц у Клічаве і Клічаўскім раёне, наладжана выдача спецадзення работнікам МТК Глыбокае ЗАТ «АСБ — Агра Цяцерына» Круглянскага раёна.

Прыярытэтным кірункам у ідэалагічнай рабоце з'яўляецца захаванне памяці аб абаронцах Айчыны. Летась было адрамантавана і адрэстаўравана 988 пахаванняў і памятных знакаў, установлена 13 новых помнікаў на суму звыш 250 тысяч рублёў.

Мінулы год быў багаты на культурныя падзеі, адбылося больш за 20 міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і рэгіянальных фестываляў і конкурсаў. Шэраг культурных мерапрыемстваў прайшоў у рамках рэспубліканскай акцыі «Бабруйск — культурная сталіца Беларусі», 750-годдзя Магілёва і 630-годдзя Бабруйска. У рэспубліканскім конкурсе «Горад культуры» Бабруйск быў прызнаны найлепшым горадам абласнога падпарадкавання за мінулы год.

Падчас калегіі былі ўшанаваныя найлепшыя работнікі ў сферы культуры і ідэалагічнай работы. Падзякай Магілёўскага аблвыканкама за шматгадовую плённую працу ў сродках масавай інфармацыі і значны ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі на рэгіянальным узроўні была адзначана і ўласны карэспандэнт «Звязды» па Магілёўскай вобласці Нэлі Зігуля.

Кар. «Звязды»

■

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША АНАНСАВАЛІ ВАЙНУ Ў КОСМАСЕ ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ

На думку начальніка штаба ВПС ЗША Дэвіда Гольдфейна, «вайна ў космасе — справа некалькіх гадоў». З падобнай заявай ён выступіў на 34-м штогадовым сімпозіуме Ваенна-паветранай асацыяцыі і выставе тэхналогій у Фларыдзе, піша Space News. «Я лічу, што мы будзем наносіць ўдары з космасу праз некалькі гадоў. І ВПС ЗША — род войскаў, які павінен кіраваць сумеснымі баявымі дзеяннямі на гэтай новай аспрэчваемай тэрыторыі. Гэта тое, чаго патрабуе краіна», — сказаў Гольдфейн, які ўпэўнены, што ЗША неабходна захапіць лідарства ў касмічнай прасторы.

ЗМЯНІЎСЯ ЛІДАР СУСВЕТНАГА РЭЙТЫНГА СВАБОДЫ ПЕРАМЯШЧЭННЯ

Германія склала з сябе паўнамоцтвы нязменнага з 2014 года лідара рэйтынга пашпартоў, які дэманструе ступень свабоды перамяшчэння грамадзян розных краін, што складаўся кампаніяй Henley & Partners. На вяршыні рэйтынга сёлета аказаліся Японія і Сінгапур, чые грамадзяне могуць без візы наведаць 180 краін свету, гаворыцца ў даследаванні кампаніі. З пашпартам Германіі, якая стала другой у топе, можна цяпер наведаць 179 краін. «Бронзу» падзялілі адразу сем краін — Італія, Фінляндыя, Іспанія, Данія, Францыя, Швецыя і Паўднёвая Карэя. Грамадзяне гэтых краін маюць права без візы наведаць 178 краін свету.

ЯПОНЦЫ ПАЧАЛІ ПАЗБАЎЛЯЦЦА АД ДОЛАРА

Японскія інвестары пачалі пазбаўляцца ад казначэйскіх аблігацый ЗША і іншых доларавых актываў на фоне асцярог далейшага паслаблення амерыканскай валюты з-за раздзімання нацыянальнага бюджэту адміністрацыяй Трампа, піша Wall Street Journal. Японскія інвестары, у тым ліку ўрад, трымаюць казначэйскія паперы ЗША на суму 1,1 трлн долараў, займаючы другое месца пасля Кітая сярод найбуйнейшых крэдыторaў Вашынгтона. Асцярогі ў іх узніклі пасля заявы міністра фінансаў ЗША Стывена Мнучына ў студзені аб тым, што «слабы долар добры для гандлю».

ПАТРЭБНЫ ЎЗГОДНЕНЫЯ МЕРЫ

Дзяржстандарт выступае за партнёрскую работу ў ЕАЭС

Пра гэта паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі Віктар НАЗАРАНКА перад выніковай калегіяй ведамства.

«Сёння камітэт з удзелам іншых органаў дзяржкіравання настойліва ідзе па шляху ўнясення змяненняў у дагавор аб ЕАЭС, фарміравання разумнага механізма ўзаемадзеяння наглядных органаў краін. Яны павінны забяспечыць партнёрскую работу, каб адсочваць любое парушэнне і прымаць узгодненыя меры, — сказаў Віктар Назаранка. — Мы лічым непрымальным, калі ў нашых краінах можа раптам узнімацца пытанне пра тое, што трэба спыніць пастаўкі той ці іншай прадукцыі або забараніць пастаўкі з цэлага прадпрыемства. Ёсць шмат важных тэм, якія мы павінны абмеркаваць з нашымі расійскімі партнёрамі, знайсці з імі эфектыўны механізм узаемадзеяння».

Старшыня Дзяржстандарта таксама адзначыў, што Беларусі важна выбраць правільныя арыенціры ў рабоце ў рамках ЕАЭС. «Акрамя плюсоў, у саюза ёсць слабыя сферы, якія засталіся значнай праблемай для нас і вельмі сур'ёзна адбіліся на таварах, якія знаходзяцца ў сферы абароту на рынку краіны. Той стан нявызначанасці з пункту гледжання бяспекі і гарантыі якасці, у якім знаходзяцца многія віды прадукцыі, нас сёння не задавальняе», — адзначыў Віктар Назаранка.

На калегіі адзначалася, што ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза па стане на 1 студзеня 2018 года прынята 45 тэхнічных рэгламентаў, 37 з якіх уступілі ў сілу. У тым ліку летась было прынята пяць новых тэхрэгламентаў: на хімічную прадукцыю, абсталяванне для дзіцячых гульнявых пляцовак, сродкі забеспячэння пажарнай бяспекі і пажаратушэння, упакаваную пітную ваду, нафту, падрыхтаваную для транспарціроўкі і выкарыстання. Акрамя таго сёлета ўступаюць у сілу чатыры тэхнічныя рэгламенты ЕАЭС: з 1 студзеня — «Патрабаванні да звадкаванага вуглевадароднага газу для выкарыстання яго ў якасці паліва», з 1 сакавіка — «Аб абмежаванні прымянення небяспечных рэчываў у вырабах электратэхнікі і радыёэлектронікі», з 19 кастрычніка — «Аб бяспецы атракцыёнаў», з 18 лістапада — «Аб бяспецы абсталявання для дзіцячых гульнявых пляцовак».

На цяперашнім этапе ў краіне дзейнічаюць шэсць тэхнічных рэгламентаў, якія ўстанаўліваюць патрабаванні да адзінак вымярэння. Гэта тэхрэгламент па будынках і збудаваннях, будаўнічых матэрыялах і вырабах, мінеральных угнаеннях, кармах і кармавых дабаўках, праграмна-тэхнічных сродках плацежнай сістэмы ў банкаўскай дзейнасці і інфармацыйнай бяспецы сродкаў абароны інфармацыі.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Фінансы

На курс рубля ўплываюць знешнія фактары

Бягучы тыдзень пачаўся з прыкметнага росту курса расійскага рубля, адзначае фінансавы кансультант TeleTrade Жанна КУЛАКОВА. Па выніках валютных таргоў, 26 лютага курс расійскага рубля вырас амаль на 1 %, або на 3,18 капейкі да 3,4943. Раніцай 27 лютага тэндэнцыя працягнулася — у 10.50 раніцы расійскі рубель дадаваў яшчэ 0,5 %, ці 1,76 капейкі. Долар і еўра пры гэтым дэманструюць вельмі нязначную дынаміку.

Звязана гэта са знешнімі фактарамі — расійская валюта рэзка ўмацавалася пасля таго, як у суботу рэйтынгавае агенцтва S&P павысіла крэдытны рэйтынг Расіі з так званага «смеццевага» да інвестыцыйнага. Мінулы 2017 год паказаў, што попыт замежных інвестараў на расійскія актывы можа ўплываць на расійскі рубель нават мацней, чым цэны на нафту. Інвестараў прыцягваюць высокія працэнтныя стаўкі па расійскіх аблігацыях. Па выніках апошняга аўкцыёну аблігацый федэральнай пазыкі (АФП), які прайшоў 21 лютага, даходнасць па паперах склала 6,64 % гадавых. Гэта ў разы больш, чым даходнасць па еўрапейскіх і амерыканскіх паперах. З-за гэтага на расійскі рынак прыходзіць істотны замежны капітал. Па звестках ЦБ Расійскай Федэрацыі, на руках нерэзідэнтаў знаходзіцца ўжо траціна ўсіх выпушчаных аблігацый.

Павышэнне крэдытнага рэйтынга Расіі яшчэ больш падганяе гэты попыт, паколькі сведчыць аб зніжэнні рызык для інвестараў. Умацаванне расійскага рубля на знешніх рынках выліваецца ў яго рост і ў Беларусі. Пры гэтым, як ні парадаксальна, беларускі рубель слабее да кошыка, але затое курсы долара і еўра застаюцца адносна стабільнымі. Сёння-заўтра расійскі рубель можа працягнуць умацоўвацца. Гэтаму будзе садзейнічаць не толькі павышэнне рэйтынга Расіі, але і падатковы перыяд — расійскія кампаніі як раз цяпер выплачваюць падаткі, а пік гэтых выплат прыйшоўся на 28 лютага. У такія перыяды расійскія рублі традыцыйна карыстаюцца высокім попытам.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Беражыце сябе!

...І ТРЫ СЛАІ АДЗЕННЯ

Якія правілы трэба выконваць, каб не замерзнуць

З устанаўленнем марознага надвор'я штодзень у медыцынскія ўстановы па ўсёй краіне звяртаецца каля 30 чалавек з халадовымі траўмамі і каля 300 — з галалёднымі.

У сталіцы ў апёкавае аддзяленне Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі (БХМД) было шпіталізавана з пачатку ўстанаўлення такіх нізкіх тэмператур усяго чатыры чалавекі.

— Для Мінска гэта невялікія лічбы, — каментуе **загадчык апёкавага аддзялення БХМД Дзмітрый МАЗАЛЕЎСКІ.** — У асноўным халадовыя траўмы атрымліваюць асацыяльныя асобы, якія злоўжываюць алкаголем. Гэтым разам пацярпелыя звярнуліся своечасова, таму ім не спатрэбіліся аперацыі і ампутацыя.

Але часам здараецца і па-іншаму. Медык успамінае, як некалькі гадоў таму мужчына катаўся на лыжах за горадам, моцна замерз, пакуль дабіраўся да электрычкі. А дома прыняў гарачую ванну, выбрацца з якой самастойна ўжо не змог. У выніку прыйшлося ампутаваць галёнку і кісці рук, мужчына стаў інвалідам першай групы. Таму першую дапамогу з халадовымі траўмамі важна аказваць правільна. Тут трэба памятаць некалькі момантаў.

Паколькі такія нізкія тэмпературы тояць небяспеку для нашага жыцця, найперш пажадана звесці да мінімуму знаходжанне на адкрытым паветры. Калі працуеце на вуліцы, важна заходзіць у цёплае памяшканне і заставацца там да поўнага сагравання. Апранацца трэба ў некалькі слаёў. Дастатковую цеплаізаляцыю створаць тры слаі. Праўда, калі вы цёпла апранутыя, фізічную актыўнасць пры гэтым трэба зменшыць, бо ў вільготным ад поту адзенні рызыка атрымаць халадовую траўму павялічваецца. 80—90 % пераахаладжэнняў атрымліваюць людзі ў стане алкагольнага ап'янення: перыферычныя сасуды ад яго расшыраюцца і кароткачасовы эфект сагравання абарочваецца хуткай стратай целам цяпла. Таму ад алкаголю лепш адмовіцца. Кіроўцы аўтамабіляў, асабліва калі плануюць ехаць на далёкія адлегласці, павінны заўсёды мець на ўвазе, што ў маразы аўто можа зламацца. Таму важна запасціся цёплым адзеннем, зараджаным мабільным тэлефонам і прадугледзець спосабы ўласнай эвакуацыі, а калі аўтамабіль спыніўся на трасе, звяртацца да знаёмых ці ў экстранныя службы.

Перамясціўшыся ў цёплае памяшканне, важна памятаць, што нельга падстаўляць рукі пад гарачую ваду ці ставіць ступні на батарэю, бо менавіта праз такія сітуацыі замерзлыя тканкі і гінуць. Адагравацца трэба паступова. Замерзлыя канечнасці трэба захутаць цёплым адзеннем, выпіць цёплае (не гарачае!) пітво. Калі пацярпелы не адчувае палёгкі, трэба звяртацца па медыцынскую дапамогу. Своечасовы візіт у медыцынскую ўстанову зможа выратаваць канечнасці ад ампутацыі.

Алена КРАВЕЦ

■

ЧЫМ ЗДЗІЎЛЯЦЬ БУДЗЕМ,

або Упершыню на «Базары»

Дырэкцыя XXVII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» анансавала новыя праекты.

«Іншапланетны» цырк

Афіцыйная частка фэсту пройдзе з 12 па 16 ліпеня. Але канцэрты і іншае па традыцыі адбудуцца ў пазабазарныя дні. Першыя білеты паступілі у продаж 23 лютага.

Сёлета ўпершыню на «базары» пакажуць цыркавую праграму. Паводле слоў **кіраўніка дырэкцыі фестывалю Аляксандра СІДАРЭНКІ,** у Палацы спорту (дарэчы, на новай пляцоўцы «Базару») можна будзе ўбачыць шоу братоў Запашных «UFO. Цырк з іншай планеты». А каля галоўнай сцэны фэсту — Летняга амфітэатра — запрацуе цырк-шапіто Мікалая Чалнакова «Клаўнарыум». Між іншым, клоўнаў і артыстаў іншых цыркавых жанраў можна будзе ўбачыць і на пляцоўках пад адкрытым небам.

Цікава, што ў «Кнізе рэкордаў фэсту» плануюць зафіксаваць цыркавы рэкорд. Які? Пакуль што гэта таямніца.

Зоркі на любы густ

Сярод навічкоў, якія дадуць сольны канцэрт, заяўлены рэпер Цімаці. У Летнім амфітэатры запланавалі канцэрты Мікалая Баскава, арт-гурта «Хор Турэцкага», Ірыны Алегравай, Алены Ваенгі. Там жа адбудзецца традыцыйны гала-канцэрт «Залаты хіт», юбілейны вечар кампазітара Аляксандра Марозава...

«Звязда» ўжо паведамляла, што ўпершыню на «Базары» выступяць Эмір Кустурыца і яго «The No Smoking Orchestra» («Аркестр, які не курыць»), музыкант і кампазітар Горан Брэгавіч з «The Wedding & Funeral Band» («Вясельны і пахавальны аркестр»). А яшчэ рок-гурт «Мумій Троль». Безумоўна, самымі яскравымі падзеямі з мноствам зорак, як і ва ўсе фестывальныя гады, стануць канцэрты цырымоній адкрыцця і закрыцця «Базару».

Што датычыць кошту білетаў на фестывальныя падзеі, то яны ў сярэднім падаражэлі максімум на 8,5 % (у параўнанні з мінулым годам).

Геаграфія пашырылася

Заўсёды ў рамках самага маштабнага на постсавецкай прасторы фэсту заўважны асаблівы інтарэс да конкурсаў дзіцячых і маладых выканаўцаў. Упершыню на ўдзел у творчым спаборніцтве дзяцей паступілі заяўкі з Канады, Вялікабрытаніі і Калумбіі.

Плануецца правесці IV Міжнародную канферэнцыю з удзелам арганізатараў фестываляў з розных краін. Адбудзецца і пасяджэнне савета дырэктараў Сусветнай асацыяцыі фестываляў. Найлепшы творчы нумар гала-канцэрта «International Voice in Vitebsk» з удзелам пераможцаў міжнародных фестываляў і конкурсаў, членаў асацыяцыі, будзе ўключаны ў канцэрт урачыстага закрыцця фестывалю.

Пра новыя падрабязнасці чарговага свята культуры «Звязда» абавязкова раскажа сваім чытачам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Падзея

У Мінску прайшоў першы ў свеце кіберспартыўны чэмпіянат па CS:GO

Прызавы фонд у крыптавалюце склаў у эквіваленце 100 000 долараў

У турніры прынялі ўдзел каманды з Германіі, Швецыі, Турцыі, Балгарыі, Сербіі, Польшчы і Беларусі. Да фіналу дайшлі каманда AGO (Польшча), якая ў чвэрцьфінале выбіла з барацьбы беларускую дружыну GoodJob, і Space Soldiers (Турцыя). Перамогу святкавалі палякі, менавіта ім і дасталіся 50 тысяч долараў крыптавалюты ў эквіваленце, туркі забралі 30 тысяч долараў, а GODSENT (Швецыя) і BIG (Германія) атрымалі па 10 тысяч долараў адпаведна.

«Гэты турнір унікальны ў сусветным маштабе. У Мінск прыехалі досыць моцныя каманды, і гэта першае спаборніцтва такога ўзроўню з прызавым фондам у 100 тысяч долараў у крыптавалюце, — адзначае **Ігнат БАБРОВІЧ, сузаснавальнік кіберспартыўнай кампаніі TwogNation,** якая займалася арганізацыяй чэмпіянату. *— Ды і сама блокчэйн-платформа Play2Live, праз якую ішла трансляцыя турніру, дазваляе зарабляць токены не толькі гульцам, але і гледачам стрымаў. Нам было важна даць магчымасць як мага больш шырокаму колу людзей убачыць турнір на роднай мове, таму мы працавалі напрамую з 16 групамі касцераў. Рэдкія турніры арганізоўваюць трансляцыі на такой колькасці моў. Кіберспорт і блокчэйн — прадвеснікі будучыні, і мы ўпэўненыя, што падобных турніраў у хуткім часе будзе нашмат больш. Мне таксама прыемна, што першы такі буйны турнір прайшоў менавіта ў Беларусі, дзе ўжо легалізавалі крыптавалюты і разумеюць усе перспектывы тэхналогіі блокчэйн і магчымасці, якія яна адкрывае».*

Адзначым, што трансляцыя чэмпіянату была арганізавана праз дэцэнтралізаваную стрымінгавую платформу Play2Live сумесна з тэхналагічным партнёрам TwogNation. Два дні чэмпіянату на 16 мовах паглядзелі 240 тысяч чалавек з усяго свету. Сам турнір ужывую наведала больш за 5 тысяч чалавек.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

■

УМЕЙ СКАЗАЦЬ «НЕ»

Сёння — Сусветны дзень барацьбы з наркотыкамі

У нашай краіне на ўліку знаходзіцца каля васьмі тысяч чалавек, якія маюць наркатычную залежнасць. Але, як падкрэсліваюць спецыялісты, такога ўсплёску актыўнага выкарыстоўвання псіхаактыўных рэчываў, які назіраўся некалькі гадоў таму, калі пасля ўжывання маладыя людзі шпіталізаваліся з вострымі псіхозамі, страчвалі розум і заставаліся інвалідамі, апошнім часам не назіраецца.

Калі ў 2014 годзе з перадазіроўкай у медыцынскія ўстановы паступіў 1351 чалавек, у 2015 — 1068, у 2016-м — 759, то летась — 437. Паводле інфармацыі **галоўнага нарколага Міністэрства аховы здароўя Івана КАНАРАЗАВА,** за апошнія два гады смерці ад перадазіроўкі наркатычнымі сродкамі сярод непаўналетніх не было.

Паўплываў на такі вынік шэраг прынятых мер, у прыватнасці дэкрэт «Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў», прыняты ў 2014-м. Акрамя таго, актыўна праваахоўныя органы працуюць і ў інтэрнэце: толькі летась зачынена 13 сайтаў і 25 інтэрнэт-крамаў, якія гандлявалі наркотыкамі. За захоўванне і збыт наркатычных сродкаў пакаранне адбывае больш за чатыры тысячы чалавек, сярод іх 92 — непаўналетнія.

— Мы адна з нямногіх краін у свеце, якая цалкам забараніла вольнае хаджэнне наркотыкаў, — кажа **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Андрэй САЛАДОЎНІКАЎ.** — Новыя псіхатропныя рэчывы, як толькі з'яўляюцца, хутка ўносяцца ў спіс забароненых. І нашым вопытам зацікавіліся калегі з іншых краін.

Алена КРАВЕЦ.

ДЫПЛОМЫ «ДАРАЖЭЮЦЬ»

Услед за БДУІР аб павышэнні кошту платнага навучання абвясціў і Белдзяржуніверсітэт

Гэта тлумачыцца ростам тарыфнай стаўкі, змяненнем умоў аплаты працы прафесарска-выкладчыцкага складу і павелічэннем тарыфаў на камунальныя паслугі. Кошт навучання ў БДУ ўзрасце з 1 сакавіка. Павышэнне закранае студэнтаў усіх курсаў першай ступені дзённай і завочнай формы навучання, а таксама магістрантаў.

Напрыклад, кошт дзённай формы навучання на 1—3 курсах спецыяльнасцяў «правазнаўства» на юрыдычным факультэце БДУ, «міжнароднае права» на факультэце міжнародных адносін з 1 сакавіка складзе 3136 рублёў у год. Для студэнтаў філалагічнага факультэта па спецыяльнасцях «беларуская філалогія» і «руская філалогія», а таксама факультэта сацыякультурных камунікацый па спецыяльнасці «сацыяльная работа» навучанне будзе каштаваць 2242 рублі (гэта самыя танныя «расцэнкі»).

Каб стаць журналістам, трэба плаціць у год 2852 рублі, а міжнародная журналістыка і аўдыявізуальная журналістыка каштуюць 2978 рублёў. Навучанне на факультэтах прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій ацэньваецца ў 2600 рублёў, на фізічным, механіка-матэматычным і хімічным факультэтах — 2475 рублёў, біялагічным — 2852 рублі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Здарэнні

Ахвяра марозу і алкаголю

Трагічна і недарэчна абарвалася жыццё 50-гадовай жыхаркі пасёлка Рэчыца Столінскага раёна. Яна шукала паратунку, а знайшла пагібель.

А першапрычына трагедыі — алкаголь. Паводле інфармацыі прэс-службы Брэсцкага абласнога УУС, вечарам жанчына з сужыцелем выпівалі. Як пазначана ў афіцыйных дакументах, узнікла сварка. Але ж можна здагадацца, што было не толькі слоўнае высвятленне адносін, калі няшчасная ў 20-градусны мароз пабегла ў адной сарочцы на суседнюю вуліцу да знаёмых, каб папрасіцца на начлег. А там ці не пачулі, ці пабаяліся адчыніць ноччу... Яна ж, відаць, прысела на ганак, заснула і замерзла. Толькі каля сямі раніцы труп жанчыны агледзела гаспадыня дома. Вядзецца праверка абставін здарэння.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Сярэбраны авіябагаж

Жанчына ў Нацыянальным аэрапорце Мінск спрабавала правезці 11,5 кілаграма сярэбраных упрыгажэнняў на тэрыторыю ЕАЭС без дэкларавання і выплаты мытных плацяжоў.

Па інфармацыі Дзяржаўнага мытнага камітэта, ураджэнка Карэліі прыбыла ў Нацыянальны аэрапорт Мінск авіярэйсам Кіеў—Мінск і прайшла па «зялёным калідоры», прызначаным для перамяшчэння тавараў, якія не падлягаюць абавязковаму пісьмоваму дэкларыванню. Выгляд і вага багажу, які перамяшчаўся, выклікалі падазрэнне ў мытнікаў, у сувязі з чым жанчыне прапанавалі прайсці праз «чырвоны калідор».

Па выніках агляду рэчаў з дапамогай скануючай тэхнікі было прынята рашэнне аб правядзенні мытнага надгляду. Сярод асабістых рэчаў жанчыны была знойдзена партыя ўпрыгажэнняў і аксесуары з серабра, расфасаваныя ў мяшэчкі: больш за тысячу адзінак брошак, ланцужкоў, запінак, заціскаў, гузікаў, спражак, зашпілек і іншых прадметаў. Уладальніца багажу растлумачыла, што набыла партыю ювелірных вырабаў у Турцыі для наступнага продажу. Па факце незаконнага перамяшчэння партыі ўпрыгажэнняў і аксесуараў мытняй «Мінск-2» пачаты адміністрацыйны працэс.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Цеплыня і гасціннасць. Як у кнігах

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На сёлетнім, юбілейным кніжным свяце **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў:

— На выстаўцы сабраліся прадстаўнікі дзясяткаў краін, якія паказваюць свае кніжныя навінкі, расказваюць пра плённае супрацоўніцтва з Беларуссю, дзе з пашанай ставяцца да друкаванай кнігі. За мінулы год выдадзена каля 10 тысяч кніг — гэта сведчыць пра клопат і ўвагу кіраўніцтва краіны і грамадства. Такая колькасць выданняў была б немагчымая, каб не супольныя намаганні дзяржавы і выдаўцоў рознай формы ўласнасці — як прыватнай, так і дзяржаўнай. Мне здаецца, што такое кніжнае свята дапаможа любому чытачу знайсці тое, што цікавіць менавіта яго.

Ганаровым госцем сёлетняй кніжнай выстаўкі з'яўляецца Сербія. На іх стэндзе можна ўбачыць шмат цікавінак. Так, проста на вачах прысутных сербскі мастак Мілан Міласлаўлевіч з дапамогай аэразольных балончыкаў цёмных колераў намаляваў вялізны партрэт Івы Андрыча — вядомага сербскага пісьменніка, уганараванага Нобелеўскай прэміяй па літаратуры. Дарэчы, сёння а 13-й гадзіне можна будзе ўбачыць як Мілан стварае партрэт сербскай паэткі Дэсанкі Максімавіч.

— Культура ў цэлым і кніга ў прыватнасці з'яўляецца тым мостам, што яднае розныя народы, — адзначыў **дзяржаўны сакратар Міністэрства культуры Рэспублікі Сербія Аляксандр ГАЁВІЧ** падчас урачыстага адкрыцця свята. — Доказ таму — Мінская міжнародная кніжная выстаўка — вельмі статуснае і прэстыжнае мерапрыемства. Ні для кога не сакрэт, што Беларусь і Сербію шмат што звязвае. Найвышэйшая праява нашага ўзаемаразумення — гэта, натуральна ж, культура і яе вялікасць Кніга. Я ўпэўнены, што XXV Мінская міжнародная выстаўка будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню сяброўскіх стасункаў паміж дзвюма сяброўскімі краінамі.

Сербію на свяце ў Мінску прадстаўляе яе Нацыянальная бібліятэка — матэрыялы стэнда прысвечаны сербскай літаратуры перыяду Першай сусветнай вайны. Дарэчы, 28 лютага Нацыянальная бібліятэка Сербіі

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

акурат адзначала 168-ю гадавіну з дня свайго заснавання.

На выстаўцы прадстаўлены і стэнды іншых краін — Расіі, Германіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Кітая, Швецыі, Сірыі і іншых. Кожны — паказвае самыя цікавыя выданні кніжнай індустрыі сваёй краіны.

— Я ўпершыню на Мінскай міжнароднай выстаўцы — атрымліваю тут самыя станоўчыя ўражанні, гэта цудоўнае свята. Сустрэла шмат сяброў, партнёраў, — заўважыла **прадстаўніца Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва краін — удзельніц СНД Тамара НАСЕНКА.** — Бачу прадстаўнікоў Сербіі, Украіны, іншых краін — гэта сапраўды высокі міжнародны ўзровень, акурат такі, які павінен быць на мерапрыемстве такога вялікага маштабу. Безумоўна, для Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва краін — удзельніц СНД, сапраўды вялікі гонар быць тут і быць датычнымі развіцця літаратуры, кніжнай індустрыі і кнігадрукавання... На мінскай выстаўцы мы адразу адчулі цеплыню і гасціннасць, убачылі гатоўнасць дапамагчы і разам рабіць праекты, радуе адкрытасць удзельнікаў выстаўцы да новых працэсаў і пачынанняў.

На галоўнай сцэне выставачнага цэнтра быў прэзентаваны празаічны альманах «Terra poetica», куды ўвайшлі творы маладых аўтараў з трох краін — Расіі, Украіны і Беларусі. «Гэты альманах толькі пачынае свой шлях па краінах-суседках, — заўважыла Тамара Насенка. — Тыя водгукі, якія мы ўжо паспелі пачуць, безумоўна, пазітыўныя. Усе заўважаюць дзіўную рэч — маладосць сапраўды інтэрнацыянальная. Маладыя пісьменнікі, што ўдзельнічалі ў альманаху, — людзі, якія толькі пачынаюць свой творчы шлях. Пры ўсёй неадназначнасці палітычнай сітуацыі паміж нашымі краінамі, мы знайшлі шмат агульных пераклічак у розных аўтараў. Усё адно яны пішуць пра тое, што надзвычай падобна паміж сабой».

У першы дзень выстаўкі Нацыянальная бібліятэка Беларусі падводзіла вынікі года, які прайшоў пад знакам 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Вынікі значныя: праведзена міжнародная канферэнцыя, удзельнікаў якой ледзь змясціла вялікая зала бібліятэкі, паспяхова прайшла выстаўка, дзе ўпершыню былі сабраныя больш за 60 асобнікаў арыгіналаў Скарынавых кніг з розных краін. Але, бадай, галоўнае, — паспяхова завершаны праект «Кніжная спадчына Францыска Скарыны». Цяпер перавыданне ўсіх тамоў кніг нашага першадрукара мае кожная раённая бібліятэка, пагартаць іх можа кожны ахвотны. Гэта праца калектыву бібліятэкі была ўганаравана прэміяй «За духоўнае адраджэнне». Не абышлося без узнагарод і ўчора. Падзякі ад Нацыянальнай бібліятэкі атрымалі прадстаўнікі СМІ, якія актыўна і крэатыўна асвятлялі знакавую дату. Віктарына «Звязды» «Мая Скарыніяна» таксама не засталася незаўважанай — падзяку атрымала яе вядучая Алена Ляўковіч.

Кожны стэнд, прадстаўлены на выставе, мае свае цікавінкі. І гэта не толькі добрыя кнігі (што, безумоўна, найперш!), але і цікавыя праграмы для гасцей. Як і любімыя кнігі ў кожнага свае, так і ўражанні ад кніжнага кірмашу ў кожнага мусяць быць уласнымі, асаблівымі. Варта зазірнуць у велізарны кніжны свет, які ў гэтыя дні разгарнуўся ў беларускай сталіцы, каб самому спасцігнуць яго таямніцы.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

«ЗВЯЗДА» — РУПЛІВЫМ ГАСПАДАРАМ!»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Звязда» — руплівым гаспадарам!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 2 сакавіка да 30 чэрвеня 2018 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2018 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ, руб. кап.	Усяго з ПДВ, руб. кап.
1.	**Мінікультыватар Daewoo Power DAT 1800E**	1	361,70	361,70
2.	**Набор садовага інструменту No Brand Торнадо**	7	43,74	306,18

Усяго прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» складае: — 667,88 (шэсцьсот шэсцьдзясят сем) рублёў восемдзесят восем капеек.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Звязда» — руплівым гаспадарам!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2018 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2018 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 2 сакавіка да 12 красавіка 2018 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 2 да 31 сакавіка 2018 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксераканіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 12 красавіка 2018 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела падпіскі і маркетынгу рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатолевіч — спецыяліст 1-й катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 18 красавіка 2018 года ў 12.00 у памяшканні ўстановы па адрасе: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 набораў садовага інструменту No Brand Торнадо (па адным для кожнага рэгіёна).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — мінікультыватар Daewoo Power.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 28 красавіка 2018 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 28 красавіка 2018 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2018 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2018 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2018 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 чэрвеня 2018 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка па суботу (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефоне (017) 263 66 73, 287 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 чэрвеня 2018 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 263 66 73, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3211 ад 27.02.2018 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

1 САКАВІКА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 5 (15836)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Анастасія ЗЯЗЮЛЬКІНА:

«У МЯНЕ СВАЯ МЕТОДЫКА ВЫБАРУ ХОДУ»

Чэмпіянат краіны па шахматах сёлета прайшоў у новым фармаце, турнір адбыўся ў сценах Нацыянальнага гістарычнага музея. Яго трыумфатарам стала Анастасія Зязюлькіна: яна без асаблівых цяжкасцяў заваявала званне чэмпіёнкі Беларусі і пацвердзіла свой статус самай тытулаванай шахматысткі ў краіне. Пра тое, як удаецца захоўваць канцэнтрацыю на працягу партыі ў тры-чатыры гадзіны, што забаронена спартсменам у гэты час і як усё пачыналася для Анастасіі ў спорце, яна расказала ў сваім інтэрв'ю «Чырвонцы. Чырвонай змене».

— Анастасія, ці сапраўды шмат чаго змянілася ў фармаце правядзення чэмпіянату?

— Так, па-першае, у дзяўчат павялічылася колькасць тураў, раней іх было менш, чым у хлопцаў. Па-другое, арганізатары зрабілі агульнае для ўсіх адкрыццё і закрыццё, з-за гэтага змянілася атмасфера турніру, яна стала больш дзелавая. Ну і месца правядзення чэмпіянату, вядома, паўплывала. Раней памяшканні былі такія, што часам гулялі ў куртках (таму што было холадна), а зараз ўстанавілі дрэс-код, гульцы павінны былі прытрымлівацца дзелавога стылю.

— Вы сталі самым маладым гросмайстрам сярод дзяўчат у гісторыі айчынных шахмат...

— Гэта было ўжо даўно, я нават не памятаю калі. Жаночага майстра я магла атрымаць у гадоў 8-9, тады была трэцяй на чэмпіянаце свету для ўдзельнікаў да 10 гадоў, гэтага выніку было дастаткова. Але мы не паспелі падаць дакументы, і я яго не атрымала. З аднаго боку, дрэнна, а з другога — добра, бо быў стымул працаваць далей. Памятаю, неяк мне не хапіла ўсяго толькі паловы ачка для жаночага міжнароднага майстра, але затое праз турнір — другі я перавыканала гросмайстарскую норму.

Цяпер не дасягнула толькі звання мужчынскага міжнароднага гросмайстра, пакуль у мяне няма патрэбнай колькасці балаў і рэйтынга. Каб яго набраць, трэба гуляць у моцных турнірах, дзе выступаюць удзельнікі са званнямі, а ў нас іх не так шмат.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Найлепшая ў прафесіі

Капітан «бяспечнага плавання»

Як словам можна выратаваць ад бяды

Марына ГАНЧАРОВА магла б стаць мадэллю: у дзявятым класе яна перамагла на гарадскім конкурсе прыгажосці. Ці чыноўнікам у выканкаме: падобныя прапановы да яе паступалі. Але з усіх варыянтаў выбрала прафесію ратавальніка. Марына працуе старшым інспектарам групы прапаганды і навучання Маладзечанскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях і кожны дзень тлумачыць дзецям і дарослым правілы бяспекі.

«Напэўна, усе дашкольнікі ўжо ведаюць наш нумар», — усміхаецца капітан МНС і расказвае пра выпадак, які адбыўся ў канцы мінулага года. Жанчына пакінула дома трохгадовага сына, які захварэў, і пайшла на работу. А хлопчык патэлефанаваў ратавальнікам — папрасіў знайсці маму, бо яму было страшна ў кватэры аднаму.

Да кожнай катэгорыі слухачоў у прапагандыста свой падыход. Каб данесці інфармацыю школьнікам і моладзі, праводзяць інтэрактыўныя гульні, адаптаваныя пад пажарную тэматыку. Працоўным калектывам паказваюць відэаролікі і прапануюць «адрэпеціраваць» навыкі паводзін у надзвычайных сітуацыях. Работнікі прадпрыемстваў вучацца карыстацца вогнетушыцелем, хутка эвакуіравацца з будынка: кожны павінен ведаць свае абавязкі на выпадак пажару — хтосьці тэлефануе ў службу выратавання, нехта выдае сродкі абароны.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

На конкурсе на найлепшага ў краіне прапагандыста органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Марына Ганчарова заняла першае месца.

Медыяпрастора

УСІХ ЦІКАВЯЦЬ ТОЛЬКІ АСОБЫ

Нюансы працы «рэжысёраў» чужога поспеху

У пачатку лютага заснавальнік кампаній SpaceX і Tesla Ілан Маск запусціў у космас чырвоны аўтамабіль Tesla Roadster. Гэта машына з яго асабістай калекцыі была задзейнічана ў якасці карыснай нагрузкі пры паспяховым запуску новай звышцяжкай ракеты-носьбіта Falcon Heavy. За рулём аўтамабіля — манекен у скафандры, на прыборнай панэлі — надпіс «Без панікі!». «Касмічны аўтамабіль» падарожнічае пад музыку Дэвіда Боўі.

Фота Кацярыны БЫСТРАКОВАЙ.

Марына Калініна: «Трэба стварыць клятву піяршчыка накшталт клятвы Гіпакрата. Галоўны пасыл — не нашкодзь!»

Напярэдадні старту ракеты, здольнай даставіць на арбіту груз вагой прыкладна 64 тоны, Ілан Маск заявіў у інтэрв'ю тэлекампаніі CBS, што вырашыў адправіць сваю аўтамашыну ў палёт «проста так». «Для гэтага няма ніякай канкрэтнай падставы. Звычайна пры выпрабаваннях новай ракеты ў якасці нагрузкі выкарыстоўваюць кавалкі металу або бетонныя блокі, але гэта сумна. Аўтамашына падалася нам найбольш прыдатным для гэтага прадметам», — растлумачыў ён.

Што гэта было: парыў душы ці экстравагантны ўчынак вынаходніка і мільярдэра, які можа дазволіць сабе адправіць на арбіту замест металалому аўтамабіль? Доктар палітычных навук, дацэнт кафедры сувязяў з грамадскасцю ў палітыцы і дзяржаўным кіраванні Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Ілья БЫКАЎ упэўнены, што дарагі аўтамабіль у космасе — проста выдатная піяр-кампанія, якая сведчыць, што ў будучыні акрамя суперзапатрабаваных на сёння IT-спецыялістаў спатрэбяцца і спецыялісты самага шырокага профілю ў сферы камунікацый. Трэнды і перспектывы ў PR сталі тэмай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якую аганізавала кафедра тэхналогій камунікацыі Інстытута журналістыкі БДУ. Удзел у ёй узялі выкладчыкі, вучоныя і практыкі з Беларусі, Расіі і Украіны. У цэнтры іх увагі аказаліся пытанні і праблемы падрыхтоўкі PR-спецыялістаў, іх сацыяльная місія ў грамадстве, роля вышэйшай школы ў фарміраванні прафесійнай этыкі, развіццё крэатыўных і аналітычных навыкаў у будучых піяршчыкаў і многія іншыя.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 03 2018 г.

УСІХ ЦІКАВЯЦЬ ТОЛЬКІ АСОБЫ

Не «белыя каўнерыкі», а знакамітасці

— Усе палітыкі сёння самі з'яўляюцца сродкамі масавай інфармацыі і ў сваіх паводзінах кіруюцца зусім не логікай палітычнай барацьбы, а логікай СМІ, фактычна эвалюцыянуючы ў актыўных суб'ектаў медыяпрастораў, — сцвярджае Ілья Быкаў. — Тое ж самае можна сказаць і пра бізнесменаў. Каб быць паспяховым і «крутым», як Ілан Маск, трэба паводзіць сябе як сродак масавай інфармацыі. Гэта прыцягвае інвестараў, якія выдзяляюць грошы пад вядомага чалавека.

Яшчэ 30 гадоў назад кампаніі і карпарацыі ўзначальвалі людзі невядомыя і безаблічныя, у аднолькавых сініх касцюмах і белых кашулях, апранутыя строга па дзелавым этыкеце, якіх ніхто не ведаў у твар, але яны варочалі мільярдамі. Затое сёння прозвішчы такіх буйных бізнесменаў, як Марк Цукерберг, Персі Марневік, Інгвар Кампрад і іншыя, сталі неад'емнай часткай сучаснай медыяпрасторы. Даследчыкі адзначаюць, што ў саветах дырэктараў найбуйнейшых кампаній цяпер засядаюць не малавядомыя бюракраты і бухгалтары, а сапраўдныя знакамітасці. Інвестары жадаюць ведаць, у каго яны ўкладваюць свае сродкі, хто будзе кіраваць іх мільёнамі. Лідары павінны даказваць гісторыяй свайго поспеху і разуменнем развіцця бізнесу, што яны ведаюць, куды рухаецца рынак.

«Сучасныя камунікацыйныя тэхналогіі — гэта тэхналогіі ўплыву, якія ўздзейнічаюць на нашу свядомасць і падсвядомасць».

У ЗША, згодна з даследаваннямі кантэнту найбуйнейшых СМІ, у перыяд з 1993 па 2002 гады асвятленне дзейнасці CEO (гэта найвышэйшая кіраўніцкая пасада) вырасла на 75 працэнтаў. У Еўропе адзначаецца аналагічная тэндэнцыя: у 50 найбуйнейшых СМІ асвятленне CEO выраслa на 127 працэнтаў за перыяд з 1997 па 2001 год.

Калі прааналізавалі вынікі апошніх парламенцкіх выбараў у Вялікабрытаніі, то высветлілася, што ў цэнтры ўвагі СМІ былі менавіта лідары палітычных партый, а пра самі партыі, якія яны прадстаўлялі, або ўвогуле нічога не пісалі, або гэта быў зусім нязначны кантэнт. Усіх цікавяць толькі асобы.

«Відавочна, што ажыццяўленне паспяховага бізнесу ў сучасных умовах дыктуе неабходнасць моцнай медыяпадтрымкі і прыцягнення спецыялістаў па персанальным брэндзінгу, іміджы і рабоце з рэпутацыяй, — падкрэслівае Ілья Быкаў. — Тое ж датычыцца і палітычных лідараў, якім трэба даказваць, што яны могуць кіраваць партыяй ці краінай і знаходзяцца ў трэндзе развіцця сусветных падзей».

Мастацтва ці маніпуляцыя свядомасцю?

— Сучасны свет перажывае значныя трансфармацыі, прычым гэта адбываецца не на працягу дзесяцігоддзяў, а цягам некалькіх гадоў ці нават месяцаў, — разважае **доктар палітычных навук, прафесар, выканаўца абавязкаў дэкана факультэта паліталогіі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандр КУРАЧКІН.** — Інтэрнэт і

Фота Кацярыны БЫСТРАКОВАЙ.

Марына КАЛІНІНА, кандыдат філалагічных навык, дацэнт кафедры рэкламы і сувязяў з грамадскасцю Інстытута журналістыкі Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса ШАЎЧЭНКІ кажа, што за апошнія пяць гадоў ва Украіне рэзка змяніліся падыходы да камунікацыі.

— Я кажу сваім студэнтам, што ёсць класічны набор ведаў і тэхналогій, якімі павінен валодаць кожны PR-спецыяліст, але акрамя арыфметыкі існуе яшчэ і кібернетыка. Стрым (прамы эфір з тэлефона) у сацыяльныя сеткі ідзе імгненна. Калі раней любая інфармацыя цэнзуравалася, штосьці можна было склеіць, падчысціць, зманціраваць і прадставіць у патрэбным табе ракурсе, то цяпер гэта немагчыма. Калі нейкая кампанія дапусціла рэпутацыйную памылку, прадала няякасны тавар ці некарэктна абслужыла кліента, інфармацыя пра гэты факт тут жа «зліваецца» ў інтэрнэт, рэакцыя сеткавыя тэхналогіі кардынальным чынам трансфармавалі нашы ўяўленні пра камунікацыі, пра тое, якімі яны могуць быць. І нават немагчыма сабе ўявіць, што нас чакае яшчэ праз пяць гадоў. Камунікацыі (віртуальныя і рэальныя) патрабуюць адэкватных адказаў. Таму ўжо сфарміраваны запыт на эфектыўных камунікатараў — не журналістаў, не піяр-менеджараў, а спецыялістаў больш шырокага плана — тых, хто можа забяспечыць узаемадзеянне, хто валодае зразумелай для розных галін мовай камунікацыі. Праграмы падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне сувязяў з грамадскасцю павінны мець міждысцыплінарны характар. На дадзены момант прафесія нумар адзін у нашым грамадстве — спецыяліст у IT-сферы. Але гэта наватары ў вузкім сэнсе. Эфектыўна выкарыстоўваць і ўкараняць ідэі і стратэгіі развіцця праграмных прадуктаў павінны спецыялісты ў галіне камунікацый, якія акрамя тэхнічных ведаў валодаюць яшчэ і значнай сацыягуманітарнай падрыхтоўкай. Ніякія веды для спецыяліста ў сферы камунікацый не могуць быць лішнімі.

Сярод новых напрамкаў падрыхтоўкі, якія ўводзяцца ў Санкт-Пецярбургскім універсітэце, — падрыхтоўка **спецыялістаў па лічбавых камунікацыях і медыякамунікацыях. Гэта будзе новае пакаленне медыявытворцаў,** здольных выпускаць медыяпрадукцыю, што раней не выраблялася.

Між іншым, стаўленне да прафесіі піяршчыка ў грамадстве зусім неадназначнае. Хтосьці лічыць піяр сапраўдным мастацтвам, а хтосьці — падманам людзей.

— Кожны будучы піяршчык павінен паглядзець серыял «Чорнае люстэрка». Я даў заданне сваім студэнтам напісаць эсэ, у якім прапанаваў выказаць сваё стаўленне да прымаўкі «Хочаш жыць — умей круціцца», — расказвае **доктар філасофскіх навук, прафесар Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта тэлекамунікацый Вячаслаў КОРНЕЎ.** — І прыкладна 95 працэнтаў з іх напісалі, што гэта высокая мудрасць. Немагчыма ўявіць, што так адказалі б студэнты трыццаць гадоў таму... Дык што ж адбылося з нашымі маладымі людзьмі і выкладчыкамі? Дзе праходзіць мяжа паміж маральным і амаральным?

«Трэба стварыць клятву піяршчыка накшталт клятвы Гіпакрата. Галоўны пасыл — не нашкодзь!»

— Вось чаму вучыць студэнтаў так, як гэта рабілі раней, немагчыма. Студэнцкая моладзь стала вельмі патрабавальнай, настойвае на раўнапраўных стасунках. І мы гэта ўсяляк вітаем, — запэўнівае Марына Калініна. — У сваёй працы робім максімальны акцэнт на практыку — узаемадзеянне з канкрэтнымі бізнес-кампаніямі, палітычнымі і дзяржаўнымі структурамі. У нас вельмі істотна за апошні час змяніліся вучэбныя планы. Мы ўжо гаворым пра камунікацыі будучыні. **Амерыканскія калегі нават уводзяць новую прафесію ў сферы камунікацый — архітэктар выбару.** Дзякуючы BigData — тэхналогіям апрацоўкі вялізных аб'ёмаў інфармацыі ў сеціве, якія адсочваюць усе нашы інтарэсы, я магу прадказаць, што майму кліенту спатрэбіцца праз год ці два, і пачынаю яго «выхоўваць», не ён «заказвае музыку», а я сваімі камунікацыямі праграмую яго на пэўныя дзеянні. Мы — спецыялісты ў камунікацыях — будзем падказваць грамадству, што яму патрэбна. Таму серыял «Чорнае люстэрка» — гэта бяскрыўдны «дзіцячы мульцік». Работа піяршчыка на апярэджанне — адна з найважнейшых кампетэнцый. Піяршчык — чалавек, які бачыць практычна ў кожным эпізодзе паўсядзённага жыцця пэўныя схемы паводзін людзей і можа растлумачыць учынкі, бачыць усё, што адбываецца «тут і цяпер».

Яд і супрацьяддзе для PR-спецыяліста

Пры такім раскладзе этычныя праблемы і сацыяльная адказнасць PR-спецыялістаў за вынікі іх працы паўстаюць яшчэ больш востра. Усе прызнаюцца, што заўсёды прасцей піярыць карпарацыю ці структуру, а зусім іншая справа — піяр асобы, бо тая можа быць супярэчлівай і не выклікаць сімпатыі.

— Значэнне рэпутацыі імкліва падае, і людзі гатовыя пайсці на тэлебачанне і зняславіцца, толькі б іх заўважылі, разумеючы, што праз пяць хвілін пасля эфіру пра іх могуць забыць, — канстатуе Ілья Быкаў. — Ёсць меркаванне, што не існуе дрэнных публікацый, акрамя некралога. Насамрэч ёсць публікацыі, якія разбураюць рэпутацыю і пазбаўляюць мільённых багацця. Вельмі складаная праблема — што можна лічыць этычным? Напрыклад, наколькі этычна выкарыстоўваюць для стасункаў з кліентам чат-боты? А кантэкстная рэклама: гэта добра ці дрэнна, калі за намі ў сеціве сочаць? У большасці падручнікаў па падрыхтоўцы PR-спецыялістаў адсутнічае глава пра этыку, таму што аўтары проста пасуюць перад гэтай складанай праблемай. Прасцей узброіць маладых людзей тэхналогіямі, і няхай тыя ўжо самі для сябе вырашаюць, што ім выкарыстоўваць, а што не. Этыка — гэта яшчэ і камерцыйнае пытанне. Намнога прасцей і танней піярыць на негатыве. Негатыўныя публікацыі, зліў кампрамату на канкурэнтаў могуць быць даволі эфектыўнымі, але дзякуючы такім тэхналогіям фарміруецца негатыўнае меркаванне пра піяр, і мы ўсе нясём калектыўныя страты. Пазітыўны піяр каштуе даражэй, але гэта доўгатэрміновыя інвестыцыі.

«Этыка — гэта яшчэ і камерцыйнае пытанне. Намнога прасцей і танней піярыць на негатыве».

— Я неаднойчы задумвалася над тым, што трэба стварыць клятву піяршчыка накшталт клятвы Гіпакрата. Галоўны пасыл — не нашкодзь! Заўсёды кажу сваім студэнтам, што я даю ім яд і супрацьяддзе. У чым заключаецца яд? У тым, што сучасныя камунікацыйныя тэхналогіі — гэта тэхналогіі ўплыву, якія ўздзейнічаюць на нашу свядомасць і падсвядомасць, гэта вельмі сур'ёзная зброя. І, на жаль, мы яшчэ не ведаем пра ўсе наступствы яе выкарыстання, — падкрэслівае Марына Калініна. — А антыдот — гэта сістэма каштоўнасцяў, якую мы павінны сфарміраваць у нашых студэнтаў. Калі ў чалавека ёсць маральны стрыжань, выразная маральная планка, то ні адзін матыватар не прымусіць яго пераступіць праз мяжу. Вось чаму я заўсёды раю студэнтам: ніколі на працуйце на тых праектах, у якія вы не верыце ці якія супярэчаць вашым маральным каштоўнасцям. Упэўнена, што такі антыдот павінен атрымліваць кожны студэнт, які вывучае камунікацыйныя тэхналогіі.

Немагчыма быць дрэнным чалавекам і займацца камунікацыямі. Гэта якраз той выпадак, калі цалкам абвяргаецца прымаўка «Добры чалавек — не прафесія»...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Ключавыя прафесійныя якасці, якімі павінен валодаць спецыяліст па камунікацыях:

- ✓ **аналітычныя здольнасці;**
- ✓ **эмацыянальны інтэлект;**
- ✓ **шырокі кругагляд;**
- ✓ **сістэмнасць мыслення;**
- ✓ **крэатыўнасць і нешаблоннасць мыслення, фантазія;**
- ✓ **веданне сацыяльных камунікацый, соцыуму;**
- ✓ **ініцыятыўнасць і самастойнасць;**
- ✓ **уменне ісці на рызыку і браць на сябе адказнасць;**
- ✓ **упэўненасць, сіла волі, стрэсаўстойлівасць;**
- ✓ **камунікабельнасць;**
- ✓ **уменне ставіць правільныя пытанні;**
- ✓ **адукаванасць (пісаць, казаць, думаць);**
- ✓ **цікавасць да жыцця, да ўсяго, што яго напаўняе;**
- ✓ **цікавасць да людзей (да ўсіх без выключэння).**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Адпачні з карысцю

ВАЛАНЦЁРАМ У... ІСЛАНДЫЮ

Дзе ў свеце летам чакаюць добраахвотнікаў?

Валанцёрства — гэта карысны досвед, новыя эмоцыі і знаёмствы.

«Прывітанне з сонечнай Іспаніі! Чаго мы толькі тут не рабілі: узводзілі сцены, касілі траву... Але кожную хвіліну такое адчуванне, быццам мы трапілі на свята жыцця». «Гэта вестачка з палёў Чэшскай Рэспублікі. Шчыруем у поце твару (без жартаў!). Але і адпачываем выдатна. Гэты водпуск я запомню надоўга». «У нас усё цудоўна. Пішам проста з Ватыкана». Такія паштоўкі прыходзяць у Лігу добраахвотнай працы моладзі ад хлопцаў і дзяўчат, якія паехалі валанцёрамі за мяжу. Расказваем, як з карысцю правесці лета ў іншай краіне і што для гэтага трэба.

Міжнародныя валанцёрскія лагеры працуюць у 35 краінах. Звычайна такія праекты доўжацца два-тры тыдні. Большасць праходзіць улетку. Кірункі работы могуць быць звязаны з экалогіяй, археалогіяй, творчасцю, сацыяльнай дзейнасцю. Моладзь таксама запрашаюць валанцёрамі для падрыхтоўкі фестываляў. На сайце Лігі можна знайсці Агульную базу праектаў (цяпер там 600 прапаноў) і выбраць той, які больш падабаецца. Летась, напрыклад, моладзь магла з'ездзіць папрацаваць у музей на тэрыторыі былога канцлагера ў Германіі. Група выкладвала з сена «дарогу смерці», па якой у вайну вывозілі зняволеных (гэта дарога стала часткай экспазіцыі), разбірала архіўныя матэрыялы (лісты, малюнкі, дакументы, відэа), рабіла гравіроўку на камянях у памяць аб ахвярах.

— Набор на летнія валанцёрскія праграмы пачынаецца з сярэдзіны сакавіка. Спланаваць свае прыгоды лепш на працягу месяца. Паколькі ў адным праекце звычайна прымае ўдзел 12—14 валанцёраў, а прэтэндэнтаў з розных краін шмат, то месцы хутка разбіраюцца, — тлумачыць **старшыня праўлення Лігі добраахвотнай працы моладзі Вольга ШМІГЕЛЬСКАЯ.**

Валанцёру бясплатна забяспечваецца месца пражывання, харчаванне і суправаджэнне. Але самастойна давядзецца пакрыць транспартныя і візавыя расходы. Многія краіны адносяць свае праграмы да маладзёжных, культурных і адукацыйных — тады візы выдаюць бясплатна. Трэба таксама зрабіць узнос у Альянс еўрапейскіх валанцёрскіх арганізацый — 100 еўра.

— Адно з самых важных патрабаванняў да валанцёраў — асабістая матывацыя: ты сапраўды павінен хацець паўдзельнічаць у нейкай справе. Важна ведаць замежную мову (часцей англійскую) на базавым узроўні. Падаць заяўку можна з 18 гадоў. Верхніх узроставых планак у многіх праектах не ставяць. У нас ездзілі і бацькі валанцёраў, якія натхніліся расказамі дзяцей, і жанчыны на пенсіі, — дзеліцца Вольга Шмігельская.

Моладзь можа таксама паўдзельнічаць у розных трэнінгах і семінарах. Гэта нефармальная адукацыя, якая дае магчымасць даведацца пра глабальныя працэсы, што адбываюцца сёння ў свеце, ролю маладых у гэтым. У такіх праектах, акрамя харчавання і пражывання, звычайна кампенсуецца і дарога — да 70 працэнтаў выдаткаў. Але, каб трапіць на семінар, трэба валодаць замежнай мовай на добрым узроўні.

Часцей для валанцёрства наша моладзь выбірае краіны, якія знаходзяцца не вельмі далёка. Самая папулярная — Германія. Але некаторыя рашаюцца на паездкі і ў больш экзатычныя куткі свету — Індыю, Ісландыю.

Студэнцкі атрад «RESпубліка» ў Анапе.

Часам у Лігу тэлефануюць бацькі студэнтаў. Калі саміх хлопцаў і дзяўчат у замежных праграмах цікавяць прыгоды, то ў татаў і мам больш зямныя пытанні: бяспека, фінансавыя ўкладанні.

— Ёсць стэрэатып, што валанцёрства — гэта цяжкая праца. Але мэта праектаў зусім іншая, — адзначае Вольга Шмігельская. — Прывяду прыклад: моладзь з розных краін сабралі на пару тыдняў, каб пафарбаваць пакой для дзіцячага цэнтра. Гэта работа магла б быць зроблена прафесіяналам за дзень, і муніцыпалітэт патраціў бы на яе 80 еўра. Для 12 чалавек сабекошт знаходжання на праекце складае мінімум 250 еўра ў суткі. Розніца адчувальная. Праекты ладзяцца для міжкультурнай камунікацыі, гэта цудоўны інструмент для аб'яднання маладых людзей.

Дарэчы, каб паўдзельнічаць у валанцёрскіх праектах, неабавязкова некуды з'язджаць. Ужо ўвесну Ліга правядзе акцыю «Красавік — месяц добрых спраў». Добраахвотнікі будуць дапамагаць Беларускаму дзіцячаму хоспісу, Беларускаму дзяржаўнаму музею народнай архітэктуры і побыту і іншым арганізацыям.

Можна запісацца таксама ў студэнцкі валанцёрскі атрад «RESпубліка». На працягу года маладых людзей запрашаюць на трэнінгі па важацкім майстэрстве, а летам яны едуць у дзіцячыя лагеры адпрацоўваць свае навыкі на практыцы.

«Адно з самых важных патрабаванняў да валанцёраў — асабістая матывацыя: ты сапраўды павінен хацець паўдзельнічаць у нейкай справе».

Вольга Шмігельская заўважае, што валанцёрства — гэта не толькі новыя знаёмствы і эмоцыі. «Такія праекты дазваляюць развіваць асабістыя кампетэнцыі: кааперацыю, крытычнае мысленне, камунікабельнасць, крэатыўнасць. Гэтыя навыкі вельмі важныя, каб быць паспяховым і ў прафесіі, і ў сяброўскіх адносінах».

Летась з дапамогай Лігі каля 100 чалавек прынялі ўдзел у міжнародных валанцёрскіх лагерах, 60 — у адукацыйных семінарах па абмене, 400 — у атрадзе «RESпубліка». Больш сацыяльна актыўнымі аказаліся дзяўчаты: у 70 працэнтах выпадкаў заяўкі падаюць яны.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота з архіва Лігі добраахвотнай працы моладзі.

Гарызонты

ПАЧУЦЬ МОЛАДЗЬ. І ПАДТРЫМАЦЬ

Сустрэча міністра адукацыі Ігара Карпенкі з Рэспубліканскім каардынацыйным саветам маладзёжных парламентаў адбылася ў рамках свята «Магілёў — маладзёжная сталіца — 2018». Яна стала працягам той, што прайшла летась у 61-й мінскай школе з удзелам Прэзідэнта. «Мы дамаўляліся з вамі, што будзе каардынацыйны савет. І ён ёсць. Абмяркоўвалася тады і пытанне стварэння Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. І гэты працэс ідзе. Падобныя фарміраванні ўжо сталі неад'емнай часткай многіх гарадоў, дзе актыўна развіваецца вучнёўскае і студэнцкае самакіраванне. Гэта добрая форма стасункаў дзяржаўных структур з моладдзю», — сказаў міністр. Падчас сустрэчы навучэнцы ліцэяў, гімназій і школ задалі яму шмат пытанняў.

— Ці падтрымліваеце вы ідэю аб стварэнні асобнага маладзёжнага інфармацыйнага партала? Асноўныя звесткі пра мерапрыемствы мы чэрпаем на старонках «УКантакце», сайтах БРСМ і піянерскай арганізацыі. Больш зручна было б знаходзіць усё гэта на адным рэсурсе...

— Улічваючы, што цяперашняя моладзь не выпускае з рук планшэты і шмат часу праводзіць у сацыяльных сетках, ёсць сэнс зрабіць такі партал. Як ён будзе працаваць і як маладыя людзі на ім будуць прадстаўлены, вырашаць ім самім. Вам прасцей размаўляць са сваімі аднагодкамі на адной мове.

— У краіне існуюць студэнцкія атрады. Ці можна стварыць такія ж для старшакласнікаў?

— Такое магчыма, але пералік работ будзе звужаны, паколькі па працоўным заканадаўстве дзейнічаюць некаторыя абмежаванні па ўзросце. Мы практыкуем школьныя будаўнічыя брыгады, напрыклад. А яшчэ ёсць такое паняцце, як лагеры працы і адпачынку, дзе можна сумяшчаць і працу, і адпачынак. Наогул мы падтрымліваем ідэю занятасці моладзі. І думаем, як ёй у гэтым дапамагчы. Сёння разглядаем магчымасць вяртання вучэбна-вытворчых камбінатаў, каб вучні 9—11 класаў мелі магчымасць асвоіць якую-небудзь прафесію яшчэ ў школе. Мне, напрыклад, калі я ездзіў у студэнцкія будатрады, не перашкодзілі спецыяльнасці токара і бетоншчыка-стропальшчыка.

— Якім павінен быць сапраўдны лідар, чалавек, за якім пойдуць іншыя?

— Па-першае, лідарства павінна быць скіравана на карысць людзей, па-другое, лідар павінен ахвяраваць сваімі асабістымі інтарэсамі на карысць грамадскіх. Умоўна кажучы, калі ён будзе заклікаць на суботнік, а сам працаваць разам з усімі не будзе, яму ніхто не паверыць.

— Наколькі вядома, зараз пры паступленні ў гімназію вучням не трэба здаваць экзамены. Як прымалася гэта рашэнне? І як будзе ажыццяўляцца набор у гімназіі?

— Перад тым як прыняць рашэнне, праводзіліся пэўныя даследаванні, рабіліся сацыялагічныя зрэзы. Я, мае намеснікі, кіраўнікі абласных і гарадскіх упраўленняў паглядзелі шмат устаноў адукацыі. Узяць тую ж сельскую школу, якая апрыёры не можа стаць гімназіяй, бо яна малакамплектная. Там няма такога шырокага спектра факультатываў і гурткоў. Пры гэтым вынікі бываюць высокага ўзроўню. А ёсць гімназіі са сціплымі вынікамі. І не факт, што тое дзіця, якое паспяхова здала экзамены за 4 клас, будзе атрымліваць высокія балы ў старшых класах. Таму мы вырашылі ўсіх да 9 класа паставіць у роўныя ўмовы. А з 10-га кожны павінен будзе выбіраць, якім шляхам рухацца далей. Гімназіі ніхто не закрывае, іх патэнцыял ніхто не прыніжае, але любы педагог павінен працаваць з любым дзіцем незалежна ад таго, які вынік яно паказвае. Трэба ствараць такія сістэмы, пры якіх ва ўсіх будуць роўныя магчымасці для атрымання якаснай адукацыі.

— У Беларусі нядаўна рэалізавалі майнінг крыптавалюты. Ці будзе Міністэрства адукацыі заахвочваць гэтую сферу дзейнасці, напрыклад, увядзеннем якіх-небудзь новых спецыяльнасцяў?

— Мы ведаем, што «лічба» сёння іграе ўсё большую ролю ў эканоміцы. Але сама па сабе IT-сфера нецікавая — цікавыя адукацыйныя тэхналогіі, якія могуць быць выкарыстаны ў рэальнай вытворчасці. Зыходзячы з гэтага, мы павінны змяняць структуру эканомікі, рабіць яе больш устойлівай да гэтых выклікаў. Для таго каб быць дзяржавай, якая стабільна развіваецца, патрэбны сацыяльныя праекты, і яны ёсць у краіне. І арыентуючыся на гэта, будзем уводзіць новыя спецыяльнасці. Невыпадкова мы з міністрам прамысловасці з'яўляемся двума сустаршынямі аргкамітэта нацыянальнага чэмпіянату WorldSkills, які будзем праводзіць у маі па 39 кампетэнцыях. Тут ёсць пэўны патэнцыял, які можа быць карысны нашай краіне. І ўводзіць новыя спецыяльнасці мы будзем не дзеля нейкіх там майнінгаў, а таму, што нам трэба трансфармаваць нашу эканоміку, відазмяняць яе і ствараць падушкі бяспекі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 03 2018 г.

Знайсці сябе

ВЯДОМЫМ У 16 СТАЦЬ?

Для гэтага ўласныя праекты трэба ствараць!

Руслан КАСЦЕВІЧ, дзевяцікласнік Лядзенскай школы Чэрвеньскага раёна, — не зусім звычайны падлетак. У свае шаснаццаць гадоў ён кіруе школьнай бізнес-кампаніяй «Грашовае дрэва», з'яўляецца стваральнікам праекта па пошуку працы і падпрацоўкі LiteJob («Праца проста»). Хлопец цікавіцца бізнесам, нейрасеткамі, мовамі праграмавання, IT-тэхналогіямі, блакчэйнам. Дзякуючы ўсяму гэтаму апошнім часам ён стаў даволі вядомай медыяперсонай...

Руслан заўсёды быў актыўны. Раней меў свой YouTube-канал, браў прыклад са знакамітых блогераў. Аднак, пасталеўшы, зразумеў, што ўсё гэта несур'ёзна. «Я ў шоку, калі пераглядаю свае ранейшыя ролікі! Чым займаўся тады?» — смяецца суразмоўнік.

Ідэяй працаваць у сферы маркетынгу хлопец загарэўся пасля таго, як пачаў ад сваёй школы кожны тыдзень ездзіць у цэнтр развіцця міжнароднага прадпрымальніцтва пры БДУ. Там падлеткі атрымлівалі пэўныя веды, якія і прымянялі ў сваёй школьнай бізнес-кампаніі на практыцы.

Руслан шчыра зацікаўлены ў занятасці равеснікаў. Але дзеля гэтага, на яго думку, трэба змяніць іх... мысленне.

— Разумееце, зараз моладзь нематываваная ўвогуле, — сур'ёзна кажа малады стартапер.

Прайшоўшы шлях ад маркетолага да кіраўніка школьнай бізнес-кампаніі, у якой ніхто не сядзеў на месцы (рабілі і прадавалі прадукцыю сваёй вытворчасці: венікі для лазні, сувеніры, кухонныя прылады), Руслан зразумеў, што прыйшоў час стварыць уласнае дзецішча.

Так падчас апошніх летніх канікулаў хлопец заснаваў кампанію па пошуку працы і падпрацоўкі LiteJob і суполку з гэткай жа назвай у сацыяльнай сетцы «УКантакце». Зараз, акрамя яго, у штаце — яшчэ 12 чалавек: як школьнікаў, так і дарослых. Паслугі аказваюцца бясплатна. Каманда працуе амаль на чыстым энтузіязме. Грашовай прэміяй адзначаецца толькі самы руплівы чалавек тыдня. Аднак, як лічыць Руслан, тыя, хто прыйшоў не дзеля матэрыяльнага заахвочвання, дакладна будуць працаваць, бо ім гэта цікава.

У суполкі LiteJob — каля трох тысяч падпісчыкаў. Суразмоўнік дзеліцца, як іх прываблівалі:

— Я расказаў пра праект чалавеку, з якім пазнаёміўся на адной з інвестыцыйных платформаў. Ён адгукнуўся і пачаў фінансава нас падтрымліваць. Тады сталі рэкламавацца ў папулярных суполках — «Мінск цяпер», «Беларусь цяпер», «Твой Мінск». Таксама купілі і замацавалі на тыдзень пост у суполцы «Работа ў Мінску». І людзі пачалі звяртацца. На першым часе нават з цяжкасцю паспявалі іх абслугоўваць...

Як жа працуе кампанія? У LiteJob дастаткова проста напісаць паведамленне «Я шукаю працу». Затым свабодны аператар прышле пытанні: праца ці падпрацоўка, узрост, адукацыя, спецыяльнасць, вопыт работы ў якой-небудзь сферы, месца жыхарства, жаданыя памер заробку і пасада. Далей прэтэндэнту застаецца толькі чакаць. А вось работнік кампаніі павінен аператыўна альбо знайсці працу ў інтэрнэце, альбо звязацца непасрэдна з работадаўцамі. У выніку саіскальніку прапаноўваецца некалькі вакансій.

LiteJob адрозніваецца ад падобных праектаў тым, што ён пабудаваны па прынцыпе цэнтраў занятасці. Тут з кожным працуюць індывідуальна. Хлопец кажа: «Канешне, у нас ёсць цэнтры занятасці. Але чаму ў іх не ўсе хочуць хадзіць? Там ставяць на ўлік. Да таго ж патрабуюць шмат дакументацыі. А пасля даводзіцца яшчэ і дастаткова доўга чакаць прапановы. А ў нас, бывае, гадзіны не пройдзе, як кліент задаволены вакансіяй і назаўтра ўжо ўладкоўваецца на працу».

Руслан шчыра зацікаўлены ў занятасці равеснікаў. Але дзеля гэтага, на яго думку, трэба змяніць іх... мысленне.

У будучыні каманда разлічвае манетызаваць праект. «Хутчэй за ўсё, гэта будзе штосьці накшталт кансалтынгавай кампаніі, — каментуе стваральнік праекта. — Арганізацыі будуць звяртацца па дапамогу, а мы, зыходзячы з базы даных, зоймемся пошукам тых ці іншых работнікаў, якія падыходзяць па запатрабаванні».

Школьная кампанія прымае гасцей.

Найчасцей у LiteJob звяртаюцца людзі ва ўзросце 30—35 гадоў, сярод саіскальнікаў больш мужчын, геаграфія — як з рэгіёнаў, так і з абласных цэнтраў. У абмеркаваннях суполкі можна пакінуць водгук аб працы кампаніі. Дарэчы, там шчыра захапляюцца праектам і дзякуюць за дапамогу.

Напрыклад, трыццацігадовая Дарына Саладуха праз LiteJob неаднаразова знаходзіла саіскальнікаў на пасаду фітнес-інструктараў у свой клуб:

— Гэта ўнікальная пляцоўка, дзе самі адміністратары зацікаўлены ў тым, каб кліенты былі цалкам задаволены. Кампанія прапанавала нам шмат прэтэндэнтаў, якіх знайшлі за пару дзён. Нам трэба было набраць каля 20 работнікаў. Многія згаджаліся, бо мы прапанавалі добрыя ўмовы: годны заробак, кар'ерны рост, гнуткі графік, падтрымку ў пошуку кліентаў.

Студэнт Мікіта Трутко таксама застаўся задаволеным кампаніяй, хоць работу знайсці і не ўдалося:

— Праект карысны. Вялікі яго плюс — зручнасць і хуткасць. Я не ўладкаваўся толькі з-за таго, што вучуся на вельмі рэдкай спецыяльнасці на факультэце народных інструментаў. Аднак падпрацовак прапанавалі шмат: прамоўтарам, вячэрнім офіс-менеджарам, распаўсюджвальнікам рэкламных лістовак, прадаўцом марожанага...

Адметна, што пачынанні Руслана Касцевіча падтрымлівае, напрыклад, заснавальнік Tut.by Юрый Зісер, а таксама тройчы лаўрэат прэміі «Прадпрымальнік года Беларусі» вядомы бізнесмен Віктар Пракапеня. Яны дапамагаюць парадамі і грашыма.

Спыняцца на дасягнутым хлопец не збіраецца. Зусім нядаўна ён абвясціў пра стварэнне новага праекта — па вытворчасці фруктовых чыпсаў. «Бізнес-план гатовы. Я таксама. Гэты праект пачынаю ўжо з патрэбнымі ведамі і досведам», — піша юны бізнесмен у сацыяльных сетках. І спадзяецца на падтрымку.

Юлія АДАМОВІЧ,
студэнтка III курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Капітан «бяспечнага плавання»

Да кожнай узроставай аўдыторыі — свой падыход.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Мы павінны зрабіць так, каб інфармацыя была пачутая. Таму без акцёрскага майстэрства не абысціся — трэба ўмець заваяваць увагу слухачоў. Для прапагандыста важная мабільнасць і камунікабельнасць, а таксама дыскыпліна і арганізаванасць, бо на працягу дня ты мусіш паспець правесці некалькі сустрэч з рознай аўдыторыяй, — дзеліцца Марына.

У снежні яна стала найлепшым у краіне прапагандыстам органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях. Удзельнікам конкурсу трэба было справіцца з тэстам (адказаць на 40 пытанняў), падрыхтаваць інфармацыйныя матэрыялы, правесці журналісцкае расследаванне, прадэманстраваць аратарскае майстэрства. Марына заўважае, што спаборніцтва дало магчымасць не толькі паказаць сябе, але і пачуць карысныя парады пра тое, як удасканаліць сваю работу.

Цікава, што ў дзяцінстве яна марыла аб іншай прафесіі — педагога. «Мама вельмі хацела, каб я ім стала, — тлумачыць. — Плюс у мяне была цудоўная першая настаўніца — яркі прыклад для пераймання. Яна мне давярала: я правярала сшыткі, як дарослая, рыхтавала дошку да ўрокаў. Дома я таксама гуляла ў школу. Мы тады з бацькамі жылі ў інтэрнаце, і на нашым паверсе быў вялікі хол. Там тата абсталяваў маленькі клас. Я купляла сшыткі, збірала дзяцей і вучыла іх пісаць і чытаць. Мне гэта прыносіла вялікае задавальненне».

Пасля дзявятага класа выдатніца Марына паступіла ў сацыяльна-гуманітарны каледж у Магілёве вучыцца на педагога. Потым атрымала вышэйшую адукацыю ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова. Працавала ў родным Маладзечне выхавацельніцай у дзіцячым садку, настаўніцай пачатковых класаў. А калі даведалася, што ў пажарную часць на пасаду прапагандыста шукаюць жанчыну, у якой ёсць вопыт работы з дзецьмі, вырашыла паспрабаваць сябе ў новай дзейнасці.

— Тое, што давядзецца адмовіцца ад уборaў і насіць штодзень адну і тую ж форму, вас не бянтэжыла?

— Я не адразу надзела яе. На званне лейтэнанта ўнутранай службы мяне атэставалі толькі праз пяць гадоў. За гэты час я паспела атрымаць другую вышэйшую адукацыю — у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Калі нарэшце выдалі пагоны, была вельмі рада. Працэс пашыву формы быў для мяне такім задавальненнем! Таму сумненняў наконт таго, ці спадабаецца мне насіць яе кожны дзень, не ўзнікала.

Старшы інспектар успамінае, што, калі толькі прыйшла, была адзінай жанчынай у калектыве. На нарадах у вялікай актавай зале сядзелі яна і 60 мужчын. Тады жаночай кампаніі не хапала. Але апошнім часам прадстаўніцы прыгожага полу часцей прыходзяць на работу ў органы па надзвычайных сітуацыях. «Жанчыны і мужчыны ў калектыве дапаўняюць адно аднаго, — лічыць суразмоўніца. — Мы вучым іх быць больш мяккімі і чулымі, а яны нас — моцнымі і трывалымі».

Інспектара прапаганды Марына параўноўвае з байцом нябачнага фронту. «Мы працуем на апярэджанне надзвычайных сітуацый. Неяк на аўтобусным прыпынку да мяне падышоў малады чалавек — падзякаваць. Калі ён быў у аздараўленчым лагеры, праслухаў наш інструктаж па паводзінах на вадаёмах, аказанні першай дапамогі і потым змог выратаваць хлопца, які тануў».

Аб тым, што некалі зрабіла свой выбар на карысць прафесіі настаўніка, Марына ніколькі не шкадуе. Бо, па-першае, гэтыя веды спатрэбіліся ёй на цяперашнім месцы работы. А па-другое, педагагічныя навыкі дапамагаюць ёй як маме знаходзіць падыход да сваіх дзяцей.

У жанчыны двое сыноў — трох і шаснаццаці гадоў. Старэйшы з'яўляецца членам Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратавальнікаў-пажарных, займаецца пажарным спортам. Хоча пайсці па слядах мамы і працаваць у органах па НС. Але пакуль атрымлівае грамадзянскую прафесію — вучыцца на першым курсе Маладзечанскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа па спецыяльнасці «мехатронік апаратаў харчовай прамысловасці».

Інспектара прапаганды Марына параўноўвае з байцом нябачнага фронту. «Мы працуем на апярэджанне надзвычайных сітуацый».

Разам з актывістамі Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратавальнікаў-пажарных.

— Служба накладвае адбітак на сямейнае жыццё? Дома вы таксама капітан?

— Знаёмы майго мужа неяк пытаўся ў яго: «Чуў, што ты жаніўся на капітаншы. Строіць цябе?» А я прыходжу пасля работы, паўгадзіны адпачываю ў цішыні і іду на кухню, дзе мяне ніхто не бачыць, — смяецца Марына. — Дысцыплінай у нас займаецца тата. А ў мяне хапае іншых абавязкаў — дома я проста жонка і мама.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Мінск — Маладзечна — Мінск.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«УДАЧНЫЕ ПРИЗЫ ДЛЯ ДАЧИ И РЫБАЛКИ!»

outlet центр распродаж

1. Наименование рекламной игры.

Настоящая рекламная игра называется «Удачные призы для дачи и рыбалки!» (далее – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – «Правила») согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

2. Сведения об Организаторе.

2.1. Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак», УНП 192325716, зарегистрировано 20 августа 2014 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192325716 (далее – Организатор).

2.2. Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, 3-й этаж.

2.3. Заинтересованным лицом Игры является ОАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис».

3. Территория проведения Игры.

Установленные Правилами проведения рекламной игры магазины, объекты общественного питания, павильоны и островки, расположенные на территории ТЦ «АУТЛЕТО (OUTLETO)» г. Минск, пр-т Жукова, 44.

4. Период проведения Игры.

Игра проводится в период с 05.03.2018 г. по 20.05.2018 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

5. Комиссия по проведению Игры.

Для контроля за ходом Игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры. Комиссия состоит из председателя и 4 членов.

Председатель Комиссии:

Рагина Дарья Михайловна – специалист по маркетингу и рекламе ОАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис»:

Члены комиссии:

Никифорова Ольга Александровна – директор ООО «Мятный знак»;

Протько Марина Вячеславовна – главный бухгалтер ООО «Мятный знак»;

Шубич Татьяна Леонидовна, специалист по маркетингу ООО «Мятный знак»;

Бондаренко Надежда Дмитриевна – супервайзер ООО «Мятный знак».

Комиссия осуществляет контроль за соблюдением установленных Правил проведения Игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны Участников.

Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение срока проведения Игры.

6. Цель Игры.

Игра проводится в целях продвижения товаров и услуг, реализуемых в следующих магазинах, объектах общественного питания, павильонах и островках, расположенных на территории ТЦ «АУТЛЕТО (OUTLETO)».

ShoesTerra (Шуз Терра)	GALANTEYA	Обед Буфет
Sushi House (Суши Хаус)	Sister's	Фанипрайс
BURVIN (Бурвин)	Калінка	VIVA Rovar (Вива Ровар)
Связной	Профипринт	Аленка
Био Косметика	Волшебный остров	КотикиСобачки
Все нипочем	Это Я	AGT DI VO (АГТ ДИ ВО)
Павильон № I-27 в период с 05.03.18 г. по 15.03.18 г. (кожгалантерея) Павильон № I-25А в период с 16.03.18 г. по 13.04.18 г. (кожгалантерея)	FreshLine (Фрэшлайн) (кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий)	Островок № 5 на 1-м этаже около траволатора в период с 05.03.18 г. по 27.03.18 г. (кофейня) Островок на 1-м этаже напротив магазина «GALANTEYA» в период с 28.03.18 г. по 13.04.18 г. (кофейня)
Островок № 8 на 1-м этаже (мобильные телефоны и аксессуары)	Островок на 1-м этаже напротив магазина «Купалинка» (детские настольные игры)	Островок на 1-м этаже напротив магазина «Купалинка» (игрушки антистресс)
Brows Curls beaty bar (Бьюти бар бровей и ресниц)	Павильон № II-21 (спортивные товары)	Островок в павильоне № I-02 (ремонт телефонов)
PROцветы (Процветы)	Kari (Кари)	Vual (Вуаль)
Островок № 7 на 1-м этаже (Family Nail bar (Семейный нэйл бар)	Островок № I-43 на 1-м этаже (кофейня)	Эксмо АСТ cash&carry (Эксмо Аст)
Glo-Story (Гло Стори)	Островок № 11 на 1-м этаже (сухофрукты)	LUDMILA LABKOVA (Людмила Лабкова)
Ниточка	Westerly (Вестерлай)	Slavia (Славия)
МайКейс	COLIN'S	Блакит
Чистый Остров	Сток Идея	Островок № 9 на 1-м этаже (парфюмерия и аксессуары)
33 пингвина	Оптика	

7. Участники Игры.

7.1. Участниками Игры могут быть:

• граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет;

• иностранные граждане, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и достигшие 18 лет;

• лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и достигшие 18 лет;

• лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь и достигшие 18 лет.

7.2. Участниками Игры не могут быть члены Комиссии, а также лица, состоящие в трудовых отношениях с организатором, их супруги, их близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства.

8. Условия участия в Игре.

8.1. Для участия в Игре физическому лицу необходимо:

8.1.1. В период с 10.00 05.03.2018 г. по 21.30 13.04.2018 г. совершить покупки/оплатить услуги на сумму не менее 100 (ста) белорусских рублей 00 копеек в участвующих в игре магазинах, объектах общественного питания, павильонах и островках ТЦ «АУТЛЕТО (OUTLETO)» (чеки из разных магазинов, объектов общественного питания, павильонов и островков ТЦ «АУТЛЕТО (OUTLETO)», подтверждающие совершение покупки/оплаты услуги в период с 10.00 05.03.2018 г. по 21.30 13.04.2018 г. суммируются). Список магазинов, объектов общественного питания, павильонов и островков, участвующих в Игре, указан в п. 6 настоящих Правил.

8.1.2. В период с 10.00 05.03.2018 г. по 22.00 13.04.2018 г. зарегистрировать чек (чеки) на инфоцентре ТЦ «АУТЛЕТО (OUTLETO)» на первом этаже и заполнить карточку участника Игры в период с 10.00 05.03.2018 г. по 22.00 13.04.2018 г.

8.1.2.1. Карточка участника Игры состоит из двух частей и содержит следующие обязательные для заполнения поля:

«Фамилия», «Имя», «Отчество», «Адрес проживания», «Контактный телефон», «Дата заполнения», «Подпись», «Приз» (выбрать приз, в розыгрыше которого участник Игры хочет принять участие, поставив галочку напротив указанных призов «Прицеп бортовой» или «Прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов»).

Порядковый номер участника Игры содержится на двух отрывных частях карточки участника. Одна часть карточки с порядковым номером передается участнику Игры, вторая часть с таким же порядковым номером и с заполненными участником личными данными забрасывается в лототрон для участия в розыгрыше призов Игры.

8.2. Инфоцентр работает с 05.03.2018 г. по 13.04.2018 г. с 10.00 до 22.00.

8.3. Чек (чеки), на который уже оформлена карточка участника, не может быть использован повторно, на обратной стороне чека делается пометка с номером карточки участника.

8.4. На каждые 100 (сто) белорусских рублей выдается 1 (одна) карточка участника. Один участник в период с 05.03.2018 г. по 13.04.2018 г. может заполнять неограниченное количество карточек.

8.5. Не допускаются к участию в Игре физические лица, которые:

– не зарегистрировали чек (чеки) на инфоцентре ТЦ «АУТЛЕТО (OUTLETO)»;

– совершили покупки/оплатили услуги до 10.00 05.03.2018 г. или после 21.30 13.04.2018 г.

8.6. Сохранить до выдачи Приза оригинал чека (чеков) и карточку Участника с порядковым номером, подтверждающие факт совершения покупки/оплаты услуги, а также регистрации.

9. Состав и размер призового фонда.

Призовой фонд Игры в размере 9 255 (девять тысяч двести пятьдесят пять) белорусских рублей 72 копейки формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица и состоит из:

№ п/п	Наименование призов, участвующих в розыгрыше	Название приза далее в Правилах	Кол-во (шт.)	Стоимость за 1 ед., бел. руб.	Всего стоимость, бел. руб.
1	прицеп бортовой. САЗ-82994-20 (1800х1142х300), САЗ-82994-20 («Саранский завод автосамосвалов» ОАО, г. Саранск). X3E829940H0059552	Прицеп бортовой	1	1 181,22	1 181,22
2	прицеп бортовой. САЗ-82994-20 (1800х1142х300), САЗ-82994-20 («Саранский завод автосамосвалов» ОАО, г. Саранск). X3E829940H0059777	Прицеп бортовой	1	1 181,22	1 181,22
3	прицеп бортовой. САЗ-82994-20 (1800х1142х300), САЗ-82994-20 («Саранский завод автосамосвалов» ОАО, г. Саранск). X3E829940H0063793	Прицеп бортовой	1	1 181,22	1 181,22
4	прицеп бортовой. САЗ-82994-20 (1800х1142х300), САЗ-82994-20 («Саранский завод автосамосвалов» ОАО, г. Саранск). X3E829940H0059554	Прицеп бортовой	1	1 181,22	1 181,22
5	прицеп бортовой. САЗ-82994-20 (1800х1142х300), САЗ-82994-20 («Саранский завод автосамосвалов» ОАО, г. Саранск). X3E829940H0059776	Прицеп бортовой	1	1 181,22	1 181,22
6	прицеп бортовой. САЗ-82994-20 (1800х1142х300), САЗ-82994-20 («Саранский завод автосамосвалов» ОАО, г. Саранск). X3E829940H0063818	Прицеп бортовой	1	1 181,22	1 181,22
7	прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов г/п 570 кг. САЗ-82993-08ОЦ («Саранский завод автосамосвалов» ОАО, г. Саранск) X3E82993MH0000289	Прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов	1	1 084,20	1 084,20
8	прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судо г/п 570 кг. САЗ-82993-08ОЦ («Саранский завод автосамосвалов» ОАО, г. Саранск) X3E82993MH0000290	Прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов	1	1 084,20	1 084,20

10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда.

10.1. Розыгрыш проводится в ТЦ «АУТЛЕТО (OUTLETO)» (г. Минск, пр-т Жукова, 44) 14 апреля 2018 г. в 14.00.

10.2. Розыгрыш призового фонда проводится открыто с возможностью присутствия на нем участников Игры. Результаты розыгрыша Игры не должны зависеть от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

10.3. Всего за период проведения Игры Организатором проводится 1 (один) розыгрыш призового фонда, в ходе которого Победители будут определяться из числа участников игры, зарегистрировавших чек (чеки) на инфоцентре ТЦ «АУТЛЕТО (OUTLETO)» в соответствии с настоящими Правилами. Розыгрыш призов производится в порядке, согласно Таблице 1.

Таблица 1

Участвуют Участники, которые зарегистрировали чек (чеки) на промо-стойке Игры, подтверждающие совершение покупки/оплаты услуги в период и	Участвуют Участники, указавшие приз в карточке участника	Призовой фонд для розыгрыша
с 10.00 05.03.2018 г. по 22.00 13.04.2018 г. (чек (чеки), подтверждающий (-ие) совершение покупки/оплаты услуги в период с 10.00 05.03.2018 г. по 21.30 13.04.2018 г.)	Прицеп бортовой	Прицеп бортовой – 6 шт.
с 10.00 05.03.2018 г. по 22.00 13.04.2018 г. (чек (чеки), подтверждающий (-ие) совершение покупки/оплаты услуги в период с 10.00 05.03.2018 г. по 21.30 13.04.2018 г.)	Прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов	Прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов – 2 шт.

10.4. К моменту розыгрыша карточки участников, соответствующие Правилам, сортируются по выбранному участником Игры Призу и загружаются в два лототрона:

Лототрон № 1 – загружаются карточки участников, в которых выбран приз «Прицеп бортовой».

Лототрон № 2 – загружаются карточки участников, в которых выбран приз «Прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов».

В случае если в карточке участника выбраны призы «Прицеп бортовой» и «Прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов», то такая карточка участника загружается в Лототрон № 1.

10.5. Розыгрыш осуществляется путем вращения лототрона. Все карточки участников, соответствующие Правилам, в присутствии членов Комиссии перемешиваются, затем один из членов Комиссии или выбранный ими любой желающий из присутствующих на розыгрыше посетителей торгового центра путем случайного выбора достает из лототрона карточку участника — так определяется Победитель для каждого Приза.

10.6. После определения Победителей Призов для обеспечения полной выдачи призов Организатор для каждого Приза определяет Резервных победителей в количестве согласно Таблице 2. Определение Резервных победителей происходит согласно порядку, установленному п. 10.4. Правил.

Таблица 2

№ п/п	Наименование Приза	Количество Резервных победителей
1	Прицеп бортовой	3
2	Прицеп для перевозки гидроциклов и маломерных судов	1

11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша призового фонда. Место, порядок и срок выдачи выигрышей.

11.1. Организатор уведомляет Победителей/Резервных победителей о выигрыше письменно заказным письмом с уведомлением и по телефону в сроки, указанные в Таблице 2.

11.2. Выдача Призов проводится по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, 3-й этаж с 17.00 до 21.00 в сроки, указанные в Таблице 3.

Таблица 3

Сроки уведомления	Сроки выдачи Приза
Основные победители	
по 18.04.2018 г. включительно	по 03.05.2018 г. включительно
Резервные победители	
в течение 2 (двух) дней с момента определения Победителем Приза, но не позднее 07.05.2018 г.	по 20.05.2018 г. включительно

11.3. При получении Приза Победитель должен предоставить Организатору паспорт, карточку участника Игры с выигравшим номером и оригинал чека (чеков), подтверждающий/-ие совершение покупки/оплату услуги.

11.4. В случае если Победитель не может получить Приз лично, приз может получить его законный представитель (доверенное лицо), предоставив лично доверенность от Победителя на получение Приза, заверенную нотариально.

11.5. Приз вручается Резервному победителю в случае, если основной Победитель:

– отказывается от получения Приза, о чем письменно извещает Организатора;

– не предоставляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

– не является для получения приза в сроки, установленные Правилами;

– не выполнил все условия Игры, установленные Правилами.

11.6. Удержание с Победителя игры подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи Приза. При невозможности удержать исчисленную сумму подоходного налога с дохода Победителя по причине отсутствия ему денежных выплат и (или) отказа плательщика внести причитающиеся суммы подоходного налога с Победителя Организатор обязан в месячный срок со дня выявления указанных фактов направить в налоговый орган по месту жительства плательщика сообщение о сумме задолженности по подоходному налогу с Победителя.

12. Права и обязанности участников Игры.

12.1. Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов.

12.2. Победители дают свое согласие на рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в глобальной компьютерной сети Интернет, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты им какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры.

12.3. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

12.4. Победители, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрышей, сроки публикации.

13.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

13.2. Результаты розыгрышей Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 16.05.2018 г.

14. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Игры.

14.1. Все возможные вопросы и претензии участников в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, 3-й этаж.

14.2. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону 8 029 157 57 50 с 10.00 до 22.00.

15. Общие положения.

15.1. Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

15.2. Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3208 от 26.02.2018
выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь

Извещение о проведении аукциона	
Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Продавец	ООО «Мир компьютеров», г. Брест, ул. Гоголя, д. 5, каб. 133

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Незавершенное законсервированное капитальное строение	Здание специализированное розничной торговли	782,2 кв. м	100/U-9579	Брестская обл., г. Брест, ул. Березовская, 3

Составные части и принадлежности	Подвал
Сведения о земельном участке	Земельный участок, общ. пл. 0,0895 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения с инвентарным номером 100/U-9579
Начальная цена без НДС	**400 000,00 белорусских рублей**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, БИК BELBBY2X, ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**04.04.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата и время окончания приема документов	**02.04.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контакты	**+375 17 280-24-41; +375 29 317-95-42. Email: auction@ipmconsult.by**

Каменецкое районное потребительское общество проводит аукцион по продаже объекта недвижимости Каменецкого райпо

Наименование объекта – магазин «Продукты» с инвентарным номером 102/С-7464.

Местонахождение объекта – г. Высокое, улица Ленина, 7А, Каменецкий район, Брестская область.

Продавец и организатор аукциона, осуществляющий продажу объекта, – Каменецкое районное потребительское общество.

Начальная цена – 28 918,80 (двадцать восемь тысяч девятьсот восемнадцать рублей восемьдесят) копеек.

Сумма задатка – 2891,88 (две тысячи восемьсот девяносто один рубль восемьдесят восемь) копеек в кассу Каменецкого райпо или на р/с BY52BAPB30156110100110000000 в ЦБУ № 103 г. Каменец, ОАО «БелАПБ» г. Минск , БИК BAPBBY2X, УНП 200056039, ОКПО 01791825.

Условия оплаты

По согласованию победителя торгов с собственником имущества в течение 3 календарных дней, включая день подписания протокола аукционных торгов.

Аукцион состоится 12 марта 2018 г. в 10.00 по адресу: г. Каменец, ул. Брестская, 57/2, актовый зал (здание Каменецкого райпо).

Дополнительная информация размещена на сайте Брестского облпотресоюза (www.brest.bks.by).

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: 225051, г. Каменец, ул. Брестская, 57/2, кабинет юрисконсульта, с 8.00 до 17.00 по рабочим дня (понедельник – пятница) по 9 марта 2018 г. включительно

Контактные телефоны в г. Каменец: (8 01631) 2-18-67, МТС 8 029 208-52-00.

ИЗВЕЩЕНИЕ о снятии объекта с торгов

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с аукциона, назначенного на **05.03.2018, лота № 1** (незавершенное строительством не законсервированное капитальное строение (административное здание с помещениями общественного питания), общей площадью 4138,7 кв. м, расположенное на месте реконструкции здания ватного цеха и бензохранилища, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000003003794, площадь 0,1314 га, по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5).

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 31.01.2018 г.

УНП 690324015

ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении повторного открытого аукциона ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ Открытым акционерным обществом «ДОРОРС»

Лот №1. Капитальное строение (телятник) с инв. № 600/С-149893 общей площадью 886,60 кв. м, год постройки 1958. Капитальное строение (откормочник (телятник) с инв. № 600/С-149894 общей площадью 671,30 кв. м, год постройки – 1978. Начальная цена продажи – 224 000,00 (двести двадцать четыре тысячи белорусских рублей 00 копеек) с НДС. Задаток на участие в аукционе – 10 % от начальной цены продажи 22 400,00 (двадцать две тысячи четыреста белорусских рублей 00 копеек с НДС)

Объекты представляют собой одноэтажные кирпичные строения, перекрытия – деревянные балки, полы бетонные, проемы дверные и оконные деревянные.

Объекты расположены по адресу: **Республика Беларусь, Минская область, Минский р-н, Луговослободской с/с, 50/1, 50, район деревни Обчак** на земельном участке с кадастровым номером 623684100001000674, предоставленном на праве постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав на земельный участок: водоохранная зона водозабора «Фелицианова», площадь 1,0224 га; охранных зонах ЛЭП напряжением свыше 1000 вольт, площадь 0,1214 га; охранных зонах ЛЭП напряжением свыше 1000 вольт, площадь 0,0328 га.

Аукцион состоится **20 марта 2018 г. в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 62, актовый зал. Продавец объектов – Открытое акционерное общество «ДОРОРС».

Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с №BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 17.03.2018 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников – **20.03.2017 г. с 13.30 до 13.45** по месту проведения аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи с 10.00 до 18.00. Контактный телефон продавца **8 (017) 240-62-19** (по организационным вопросам); **8 (017) 501-63-39 (осмотр).** Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: **8 (017) 398-29-44**, **+375 29 615-40-08**, e-mail: **belinvo@tut.by.**

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 04.11.2017

Считать недействительными страховые полисы **СООО «Белкоопстрах»** по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 1016384, 1050424, 1051428, 1085041, 1090867, 1090689, 0910874-0910875, 1041366, 1017045, 0909186, 1065208, 0971626, 1091272, 0826971, 0826984-0826985, 0826990, 0826993-0826994, 0827000, 0869990-0869991, 0869998-0870000;

страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВА № 8129267, 3326771, 5392445, 8072327, 8072334, 8156259, 8156308, 8156320, 8156321, 8173754, 8173757, 8173771, 8675730-8675731, 8675746, серия ВВ №2492275, 2533243, 2533248-2533249, 2560157, 2493763, 2534082, 2534140, 2561951, 2561952, 2960604, 2960605, 2533776, 2905437, 2908472, 2908600, 2908605, 2908618, 2908624, 2936469;

страховые полисы по договорам страхования, заключаемым с физическим лицом (формы РН) юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (формы РП) по страхованию иному, чем страхование жизни, формы 2РН, 2РП серии БК № 0232015-0232016, 0268712, 0268739, 0286945, 0214112, 0214132, 0214133, 0242421, 0279134, 0292132, 0299216;

бланков квитанций о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии СВ № 599654, страховой полис по добровольному страхованию транспортных средств граждан формы 2РН серии БГ № 0021658, 0022353;

страховые полисы по добровольному страхованию наземных транспортных средств юридических лиц формы 2РП серии БТ № 0024252 **считать недействительными.**

УНП 100706519

ОТЧЕТ Местного фонда развития международного сотрудничества и местных инициатив «Региональное партнерство» об использовании своего имущества за 2017 год

